Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 137 (4041)
НЯДЗЕЛЯ, 24 мая 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьверскімі расстрэламі рэвалюцыйных рабочых і сялян катаваньнямі палітзьняволеных— польскі фашызм расчышчае шлях да вайны супроць СССР

На штурм прарываў веснавой сяўбы

Настойлівае і пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі партыі ў вёсцы, напрымірымая і рашучая барацьба ўсімі ўхіленьнямі ад ленінскай палітыкі забясьпечылі пераможны калгасны рух, выкананьне ў тэрмін намячэньня партыі і ўраду аб 30-ціпроцантнай калектывізацыі БССР да веснавой сяўбы.

Разгортваньне саўгаснага будаўніцтва і МТС, бязупынна нарастаючае ўзбраньне сельскай гаспадаркі БССР трактарамі і машынамі паскараюць перабудову нашай вёскі на сацыялістычны лад, паскараюць ажыцьцяўленьне лёзунгу суцэльнай калектывізацыі БССР і ліквідацыі кулацтва як клясы на гэтай базе.

Другая дэкада мая дала рашаючы посьпех у справе калектывізацыі. Намяньне партыі аб 30-ціпроцантнай калектывізацыі на 20 мая **перавыкананa.** На 1-га лютага 1931 г. у БССР налічвалася **15,9 проц.** калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. На 20 мая мы ўжо маем **30,3 проц.** За няпоўныя чатыры месяцы дасягнута амаль падвоеньне колькасьці калектывізаваных гаспадарак. Гэта — бліскучы вынік бальшавіцкай барацьбы большасьці раёнаў за калгас, вынік нашага пераможнага наступленьня на капіталістычныя элэменты гораду і вёскі.

Рад раёнаў паказваюць узор барацьбы за перабудову вёскі на сацыялістычны лад і ідуць далёка наперадзе сярэдняга паказальніка для ўсёй рэспублікі. На першым месцы — **Лепельскі раён,** які на 20 мая ўжо налічвае **71,4 проц.** калектывізацыі, **Хоцімскі** — 68,1 проц., **Клімавіцкі** — 62 проц. і некаторыя іншыя. Тэты раёны, дзякуючы рашучай барацьбе з кулаком і яго агентурай, ужо набліжаюцца да завяршэньня суцэльнай калектывізацыі.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што каля 10 раёнаў усё яшчэ ганебна адстаюць — і ў другой дэкадзе мая не дабіліся рашучага зруху. Так, **Гарадок** дае толькі 11,7 проц. калектывізацыі, **Бабруйск** — 13,8 проц., **Рэчыца** — 13,7 проц., **Парычы**—15 проц., **Чачавіцы**—15,6 проц., **Жлобін** — 16,5 проц., **Сьмілавічы** — 17,1 проц., **Чачэрск** — 18 проц. і г. д.

Цесна ўвязваючы калектывізацыю з разгортваньнем сяўбы, перадавыя раёны павінны ісьці далей наперад, каб датэрмінова выканаць і перавыкананць памяньне аб 45-ціпроцантнай калектывізацыі БССР да канца г. г. Выключнай увагі да пытаньняў калектывізацыі пэрыя чакае ад адстаючых раёнаў. Іх ударнай і неадкладнай задачай зьяўляецца падцягваньне фронту калгаснага будаўніцтва, **раўняючыся па лепшых раёнах. Гэта задача можа і павінна быць выканана яшчэ ў пэрыяд веснавой сяўбы.**

Толькі па аснове бязупыннага разгортваньня калгаснага руху адстаючыя раёны могуць выканаць плян другой бальшавіцкай вясны.

Дасягнутыя ў барацьбе за генэральную лінію партыі посьпехі ў галіне калектывізацыі забясьпечваюць усе ўмовы для выкананьня і перавыкананьня БССР вызначаных **ПАСЕЎНЫХ** плянаў. Між тым, як паказвае зводка НКЗ БССР на 20 мая, што публікуецца сёньня ў нашай газэце, **тэмпы сяўбы ганебна адстаюць.** Стварылася пагроза **свайчасовану** сканчэньню сяўбы. З 2.674.226 гэкт. засеяна толькі 445.537 гэкт.—16,7 проц. Апошняя пяцідзеўка дала толькі 9,3 проц. прыросту.

Пагражаючы ход сяўбы ў **паўднёвых** раёнах, якія павінны скончыць сяўбу да **25 мая.** Між тым, 34 паўднёвыя раёны ў сярэднім выканалі свой плян сяўбы **толькі на 24,3 проц.**

Ня лепшае становішча і ў сярэдняй частцы БССР, якая павінна скончыць сяўбу да 1 чэрвеня. 41 раён сярэдняй часткі рэспублікі далі ўсяго 15,9 проц. свайго пасеўнага пляну.

Цягнуцца ў хвасьце і паўночныя раёны, якіх павінны скончыць сяўбу да 5 чэрвеня. 23 паўночныя раёны, пераважна ільнаводчыя, выканалі толькі 7,7 проц. свайго пасеўнага заданьня.

МТС яшчэ таксама ня сталі ў перадавыя рады змагароў за бальшавіцкую сяўбу. Плян у раёнах абслугоўваньня МТС выкананы толькі на 20,4 проц. Асноўная прычына адставаньня МТС хаваецца ў яўна нездавальняючай **арганізацыі працы** як у саміх МТС (бясплянавае перакідваньне трактараў, прастоі машын, псаваньне трактараў, невыкананьне норм выпрацоўкі трактарыстамі і г. д.), так і ў калгасах, якія яны абслугоўваюць.

Калгасы выканалі свой плян усяго на 18 проц., а аднаасобны сэктар — на 16 проц. На апошнім месцы — саўгасы. Яны далі толькі 14,2 проц. свайго пасеўнага заданьня. Такое адставаньне **саўгасаў,** якія абавязаны паказваць **прыклад** калгасам і аднаасобнікам, зусім недапушчальнае. Гэта — вынік таго, што многія саўгасы БССР не перабудаваліся па-новаму, не перайшлі **на зьдзельшчыну.** Сацспаборніцтва і ўдарніцтва яшчэ ня стала ў саўгасах асноўным вагаром барацьбы за свячасовае выкананьне пасеўных плянаў. Значная доля віны падае на **саўгасныя аб'яднаньні,** якія не забясьпечылі апэрацыйнага кіраўніцтва сяўбой.

Гэтымі-ж прычынамі ў асноўным тлумачацца нездавальняючыя тэмпы сяўбы ў калгасах. На працягу апошніх некалькіх дзён **«Зьвязда»** давала шмат матар'ялаў, якія адлюстроўвалі становішча з пераводам калгасаў на зьдзельшчыну. Факты гавораць, што ў большасьці калгасаў яшчэ не наладжан правільны **ўлік** зьдзельшчыны, а гэта, па сутнасьці, азначае, што сапраўднай зьдзельшчыны няма, што замест яе мы маем у радзе калгасаў **падпраўленую падзёншчыну.** Гэта стварае спрыяючую глебу для антыкалгаснай агітацыі кулака, які імкнецца скарыстаць кожную магчымасьць для зрыву ўшчыльненьня тэрмінаў сяўбы. Треба адзначыць, што рад раённых арганізацый і асабліва райкалгасгасаўзы, праяўляючы апартуністычную недаацэнку значэньня зьдзельшчыны і яе ўліку, да гэтага **часу** ня ўжылі сапраўды рашучых мер **да ліквідацыі прарываў** у справе правільнай **арганізацыі** працы ў калгасах. Недапушчальна **мала** ў гэтых адносінах зрабілі і МТС.

Аднаасобны сэктар павінен засеяць 1.731.537 гэктараў. У яравым кліне 1931 году яго ўдзельная вага яшчэ пераважвае над калгасным сэктарам. У сувязі з гэтым адставаньне аднаасобнага сэктару зьяўляецца адным з самых **пагражаючых** вучасткаў. Гэта вынік таго, што значная частка раённых арганізацый і асабліва сельсаветаў **выпусьціла з-пад сваёй увагі** сяўбу ў аднаасобных гаспадарках. Слабая наладжана праверка выкананьня аднаасобным сэктарам узятых самаабавязацельстваў па пашырэньні пасеўнай плошчы і па засеве пэўных культур. Карыстаючыся слабай масавай работай (а ў радзе месц яна зусім адсутнічае) сярод беднякоў і сераднякоў— аднаасобнікаў, клясавы вораг павёў агітацыю за зрыў сяўбы і ў вёсках, якія сёньня яшчэ не калектывізаваны. Кулак скарыстоўвае ва ўсю апартуністычную недаацэнку сяўбы ў індывідуальным сэктары, якая дзе-ні-дзе праяўляецца з боку мясцовых арганізацый і раду работнікаў.

Веснавая сяўба 1931 г. заклікала зрабіць рэвалюцыю ў нашым **севазвароце** Асноўная ўвага пасеўным плянам аддаецца **вядучым ва ўмовах БССР культурам—ІЛЬНУ (КАНСПЛЯМ),** а таксама **КАРМОВЫМ.** Вягучая вясна павінна забясьпечыць БССР ролю аднаго з асноўных у СССР **вытворцаў тэхнічных культур,** павінна забясьпечыць моцную **КАРМОВУЮ базу сацыялістычнай ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ,** якая разьвіваецца ў нас шпаркімі тэмпамі. У сьвятле гэтага пытаньні **ЯКАСНАГА** выкананьня пасеўнага пляну набываюць **першачарговае** значэньне. Між тым апошняя пяцідзеўка дае зусім **нездавальняючыя якасныя паказальнікі сяўбы.** Ільну і канапель засеяна 6,4 проц. пляну, аднагадовых траў—5,8 проц., шматгадовых (канюшыны, цімафееўкі)—8,5 проц., гораньплодаў засеяна нязначная колькасьць — 2 проц. Сіласных культур яшчэ менш—1 проц. Калгасы далі ўсяго 4,7 проц., а саўгасы яшчэ фактычна не пачалі сяўбы ільну і канапель. Такое становішча пагражае сарваць ажыцьцяўленьне баявой дырэктывы партыі аб засеве ня менш **240.000 ГЭКТ. ІЛЬНУ І 40.000 ГЭКТ. КАНАПЕЛЬ.** Стварацца непасредная пагроза ўзмацненьню нашай **кармовай базы.**

ПРАРЫВЫ, ЯКІЯ МАЕМ НА ФРОНЦЕ СЯЎБЫ, МОГУЦЬ І ПАВІННЫ БЫЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ-Ж ДНІ. Шлях да перамогі паказваюць нам **ЛЕПШЫЯ ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ,** якія, ня гледзячы на напружанасьць плянаў і труднасьці, ужо вышлі **пераможцамі калгаснай вясны,** датэрмінова ня толькі выканалі, але і **перавыканалі свае пасеўныя пляны.** Насеньаводчы саўгас **«Слабада»** (Мазырскі раён) засеяў **551 гэктар за 10 дзён.** Рабочыя перавыканалі свае сустрэчныя нормы выпрацоўкі **на 30 проц.** Калгас **«Бальшавік»** (Старобінскі раён) скончыў сяўбу на 15 дзён **раней тэрміну, перавыканаўшы** плян. За час веснавой сяўбы ў калгасе ня было ніводнага выпадку прагулу работнікаў. Сельска-гаспадарчыя арцелі **«Чырвоная ніва»** і імя **VI зьезду** саветаў (Жыткавіцкі раён) ня толькі скончылі сяўбу, але выканалі плян сяўбы **ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ на 125 проц.**

Скончылі сяўбу і перавыканалі плян па тэхнічных культурах 12 калгасаў **СЛУЦКАГА** раёну.

Выключным узорам зьяўляецца практыка калгасу **«КАМБАЙН»,** Слуцкага раёну, які **перавыканаў усе колькасныя і якасныя паказальнікі.** Гэты калгас дабіўся выключных посьпехаў, дзякуючы **ПРАВІЛЬНАМУ ЎКАРАНЕНЬНЮ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ** і **ЎЛІКУ** яе з самага пачатку, дзякуючы разгорнутаму **сацспаборніцтву і ўдарніцтву,** якім была ахоплена ўся калгасная маса. Перавыкананьне норм выпрацоўкі калгасьнікі **«Камбайну»** адказалі кулаку і апартуністам на іх імкненьні затармазіць бальшавіцкую сяўбу. Калгас «Камбайн» на справе паказаў, што ударная работа на палёх зьяўляецца «справай гонару, славы і гэройства». Скончыўшы сяўбу, калгасьнікі пераключыліся на **практычную дапамогу суседняй адстаючай арцелі,** узяўшы яе на грамадзкі буксір і прыняўшы практычныя захады да перанясеньня туды свайго **вопыту ўдарнай працы.**

Мэтады працы калгасу «Камбайн» забясьпечваюць пасьпяховую ліквідацыю прарываў веснавой сяўбы, забясьпечваюць ушчыльненьне [illegible]най сяўбы, выкананьне і перавыкананьне якасных і колькасных паказальнікаў.

Зарукай посьпеху зьяўляецца неадкладнае перанясеньне практыкі гэтага ўдарнага калгасу ва ўсе раёны, саўгасы, калгасы і вёскі. Задача ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый—забясьпечыць раўненьне адстаючых па калгасе «Камбайн» і інш. перадавых саўгасах і калгасах, на прыклад ударных калектываў сапраўды па-бальшавіцку змагацца за тое, каб выйсьці пераможцамі ва ўсебеларускім конкурсе на ўдарнае правядзеньне веснавой сяўбы, які абвешчан ЦК КП(б)Б.

Усе сілы, усе сродкі павінны быць кінуты на штурм прарываў веснавой сяўбы, на штурм адстаючых вучасткаў. Пачынаньне Менскага гаркому КП(б)Б, які абвясьціў дэкаду штурму прарываў і ўжыў рад канкрэтных мерапрыемстваў, павінен быць падхоплен партарганізацыямі ўсіх раёнаў.

Арганізуючы бязьлітасны адпор апартуністам усіх колераў і рашуча змагаючыся з кулаком, укараняючы зьдзельшчыну ў калгасах і разгортваючы на яе аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва на палёх, мы даб'емся пасьпяховага правядзеньня другой калгаснай вясны.

Голас з-за турэмных крат

Яшчэ больш утончаныя мэтады фашысцкай расправы з палітзьняволенымі, чым у Беластоку, наглядаюцца ў ВІЛЬНІ І БЕРАСЬЦІ.

БЫЦЬЦЁ І КАТАВАНЬНЕ ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ НА ЛУКІШКАХ ПРЫ КОЖНАЙ МАГЧЫМАСЬЦІ СТАІЦЬ У ПАРАДКУ ДНЯ. Ужо некалькі месяцаў зьмешчаныя ў камэры палітвязьняў адміністрацыяй правакатары робяць проста немагчымым прабываньне палітвязьняў у камэрах. Адміністрацыя стасуе да палітвязьняў Лукішак утончаныя мэтады тэрору, напрыклад, аддзяленьне рабочых ад інтэрэвэнцыі, беларусаў ад яўрэяў, тых, якія атрымліваюць пасылкі з волі, ад тых, якія не атрымліваюць. Пераважная частка бібліятэкі сканфіскавана адміністрацыяй, сялянам даюцца толькі такія кніжкі, якія адміністрацыя лічыць няшкодлівымі (рэлігійнага зьместу).

Турэмнае харчаваньне настолькі паторшана, што **ні адзін самы здаровы чалавек на турэмным пайку больш паўгода не пражыве.** Кожнага селяніна і рабочага, якія адважваюцца прыносіць перадачы для палітвязьняў, **арыштоўваюць і садзяць у турму.»**

У Берасьці «ліквідуюцца камэры палітвязьняў. Каб палегчыць выкананьне гэтай задачы, адміністрацыя выслала значную частку палітвязьняў у Вронкі, Седлец і іншыя турмы, а рэшту разьмясьціла сярод крымінальных. Новаарыштаваных адміністрацыя пакуе ў крымінальныя камэры».

Фашысцкая дыктатура добра ведае, што па вастрогах яна трымае лепшых барацьбітоў рэвалюцыі. Таму фашысты імкнуцца або вынішчыць іх фізычна, або выбіць з іх пачуцьці чалавечай годнасьці, зрабіць сваім паслухмяным быдлам.

Пазыка падрыхтоўкі вайны супроць СССР

Гэтымі днямі польскі сойм і сэнат у сьпешным парадку, бяз звычайнай парляманцкай напышчанай фармалістыкі, прынялі закон аб так званай французскай чыгуначнай пазыцы.

У чым сутнасьць гэтай франка-польскай зьдзелкі? Умовы зьдзелкі нават зараз, калі сойм зацьвердзіў дагавор, пакрыты таямніцай. Вядома толькі наступнае: стварацца франка-польскае акцыянэрнае таварыства, якое бярэ на сябе абавязак пабудаваць чыгуначную лінію **Гдыня—Катовіцы** (Верхняя Сілезія) з веткай **Семкавіца—Чэнстахоў** і абсталяваць яе руховым саставам. Таварыству прадастаўляецца канцэсія на эксплёатацыю лініі і яе адгалінаваньняў тэрмінам на 45 год. Дарога павінна быць пабудавана на працягу 3-х год. Заснавальнікі таварыства—буйнейшы ў Эўропе **французкі ваенны канцэрн Шнэйдэр-Крэзо,** рад французкіх банкаў і польскі банк. Акцыянэрны капітал таварыства роўны **15 млн.** франкаў. (1 франк—7 к.), з якіх 8 млн. будзе знаходзіцца ў руках французкай групы капіталістаў, а 7 млн. у руках «Польскага банку», такім чынам таварыства будзе **кантрэлявацца Францыяй.**

* * *

Новая дарога павінна зьвязаць два найбольш важных у **ваенных адносінах** пункты—**Верхнюю Сілезію,** якая зьяўляецца мэталюргічнай і апалавай базай усёй прэмысловасьці Польшчы і **польскі ваенны порт** у Бальтыцкім моры—**Гдыню.**

У Верхняй Сілезіі гэта дарога сальлецца з сыстэмай чыгунак, якія вядуць з Чэха-Славакіі ў Польшчу. Апрача таго, паводле паведамленьня нямецкага друку, ёсьць плян прадоўжаньня гэтай лініі для таго, каб **злучыць польскую ваенна-забесьпячальную лінію з дарогамі «саюзьніцы» Румыніі:** праз **Катовіцы—Кракаў, Лембэрг** і ў Румыніі—**Чэрновіцы, Галаца,** дзе гэта чыгунка знойдзе выхад ў мора.

Другі морскі канец чыгункі—Гдыня будзе тым пунктам, праз які будуць праходзіць морскім шляхам усе **ваенныя грузы,** якія **накіроўваюцца імпэрыялістычнымі дзяржавамі Польшчу ў часе вайны.**

Гэта дарога, знаходзячыся далёка ад усходніх (савецкіх) межаў, забясьпечвае хуткую перакідку ваенных грузаў як з порту Гдыня, так і з варожай СССР Чэха-Славакіі з яе буйнейшымі ў Эўропе ваеннымі заводамі Шкода, у любы пункт Польшчы. Дарога будзе галоўна[illegible] ваенна- забесьпячальнай лініяй вас[illegible]даў Францыі (Польшча, Чэха-Славакі[illegible] Румынія), высунутых ёй на перадавы[illegible]пасты вайны супроць СССР.

Немалаважнае значэньне мае і ветка[illegible] якая праектуецца—Семковіцы—Чэнст[illegible]хоў. Яна непасрэдна зьвяжа новую ч[illegible]гунку з **раёнам сканцэнтраваньня поль[illegible]скай ваеннай прамысловасьці** і з Дн[illegible]броўскім каменна-вугальным басэйнам.

Гэтыя акалічнасьці і выгадныя ле[illegible] франка-польскай зьдзелкі. Сусьветка[illegible] буржуазія, на чале з французкай, фа[illegible]суе падрыхтоўку ваеннага нападу н[illegible] Савецкі Саюз.

Перад наяўнасьцю посьпехаў сацыяліс[illegible]стычнага будаўніцтва, якое ўзмацняе м[illegible]гутнасьць краіны Саветаў, сусьветны і[illegible]пэрыялізм рыхтуецца да вайны з нам[illegible]па ўсіх правілах ваеннага і тэхнічнага [illegible]мастацтва. Французкая пазыка і канц[illegible]сія азначаюць новы важнейшы эта[illegible]па шляху падрыхтоўкі вайны супро[illegible] СССР. Дзеля гэтага польскі фашызм н[illegible]спыніўся ні перад якімі ахвярамі. «Ка[illegible]лі што-небудзь робіцца па палітычны[illegible]меркаваньнях, дык мяжы ўступак ня[illegible]гул ня існуе», так выразна фармулю[illegible] пазыцыю польскага ўраду ў пытаньн[illegible] аб пазыцыі афіцыяльны орган рады м[illegible]ністраў—«Польска-Гаспадарча».

Аўбэр.

Ліквідацыя беларускай гімназіі ў Клецку

ВІЛЬНЯ, 23. Дзікія прасьледваньні фашысцкімі акупантамі нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі ня спыняюцца. Побач з арыштамі тысячы рэвалюцыйных рабочых і працоўных сялян ахранка, ПРЫ АКТЫЎНЫМ УДЗЕЛЕ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТАЎ — АСТРОЎСКАГА, ЛУЦКЕВІЧА І К°, канчаткова ліквідуе яшчэ ўцалелыя культурна-асьветныя ўстановы і арганізацыі.

Фашысцкая віленская прэса гаворыць, што гэтымі днямі ЗАКРЫТА БЕЛАРУСКАЯ ГІМНАЗІЯ Ў КЛЕЦКУ. Як вядома, гэта гімназія таксама была сфашызавана, як і віленская. У часе фашызацыі яе беларускімі нацыянал-фашыстамі ў 1929 годзе — БЫЛО ЗВОЛЬНЕНА КАЛЯ СОТНІ ВУЧНЯЎ ЗА РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПЕРАКАНАНЬНІ І ПЕРАДАНА Ў РУКІ ДЭФЭНЗЫВЫ. Але відаць дрэнныя справы беларускіх нацыянал-фашыстаў у гэтай гімназіі, калі, ня гледзячы на такую грунтоўную чыстку, яны прымушаны былі закрыць яе.

Сутычкі сялян з паліцыяй ня спыняюцца

ВІЛЬНЯ. Няспавісьць працоўнага сялянства да фашысцкіх акупантаў распальваецца ўсё больш і больш. Адзін выгляд паліцэйскага ўжо выклікае ў сялян абурэньне і гнеў.

У **Тракелях,** дзе падчас сьвят сабралася вялікая колькасьць сялян, паліцэйскі зрабіў спробу арыштаваць аднаго хлапца. Натоўп сялян зараз-жа **вызваліў арыштаванага.** Прыбыўшая на дапамогу паліцэйшчына напала на сялян. Распачалася бойка. Натоўп **адказаў градам каменьняў. Паліцэйскія далі некалькі залпаў.** У выніку **адзін чалавек забіты і шмат паранена.** Прыбыўшы праз некаторы час значны паліцэйскі атрад разагнаў натоўп сялян, **арыштаваўшы 9 асоб.**

Новыя тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу

ВАРШАВА. Масавае скарачэньне рабочых адбываецца амаль ва ўсіх галінах польскай прамысловасьці. Пасьля шматтысячных звальненьняў у Верхняй Сілезіі, распачаліся такія-ж самыя звальненьні рабочых і ў лодзінскай тэкстыльнай прамысловасьці. У прамысловых прадпрыемствах **Шайблера і Гротмана,** а таксама і **Гейера звальняецца звыш 2.450 рабочых.**

Масавыя арышты ў Лідчыне

ВІЛЬНЯ. Як паведамляе віленск[illegible] фашысцкі друк, у Лідзе фашысцкая ах[illegible]ранка распачала **масавыя арышты.**

У апошнія часы ў Лідчыне ўзмац[illegible]ніўся рэвалюцыйны рух сялянства. Масавае адмаўленьне сялянства ад пла[illegible]цяжу падаткаў, барацьба супроць эк[illegible]зэкуцый і прымусовай працы (шарвар[illegible]кі) **пашыраецца з надзвычайнай шпар[illegible]касьцю.**

Устрывожаная фашысцкая ўлад[illegible] распачала шалёны тэрор, мяркуючы г[illegible] стыч спыніць антыдзяржаўны рух ся[illegible]лянства. Пачаліся масавыя арышты. [illegible] аднэй тольки Лідзе было арыштаван[illegible] звыш **19 чалавек.** Арышты, як пав[illegible]дамляе фашысцкі друк, ня спыняюцца.

Вышэй сьцяг бальшавіцкай самакрытыкі

Парткалектыў заводу „Камунар", ня раз паказаўшы прыклады гэраічнай барацьбы за прамфінплян, павінен хутка, па-бальшавіцку ліквідаваць прарыў у разгортваньні пралетарскай самакрытыкі— маўтнага вагара барацьбы за выкананьне і перавыкананьне вытворчых плянаў

У месячнік друку дабіцца паляпшэньня партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам, поўнай рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па гэтых пытаньнях

Улічыць урокі

Пралетарская самакрытыка — бальшавіцкі мэтад барацьбы супроць скажэньняў генэральнай лініі партыі, супроць апартунізму розных колераў супроць перашкод выкананьню пяцігодкі за чатыры гады.

Друк — гэта моцная зброя партыі — важнейшы вагар разгортваньня дзейснай самакрытыкі.

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі фабрычна-заводзкі друк упарта змагаецца за бальшавіцкія тэмпы, за ліквідацыю прарываў, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, мэтадам самакрытыкі выкрывае канкрэтныя прычыны і асоб, вінаватых у зрыве прамфінпляну, мабілізуе ўвагу грамадзкасьці на асноўных бягучых задачах у барацьбе за плян.

Правільнае партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам — важнейшая ўмова масавасьці, палітычнай баяздольнасьці і вытрыманасьці лініі газэты.

У месячнік друку мы абавязаны праверыць становішча партыйнага кіраўніцтва газэтамі, **як** выконваецца пастанова ЦК УсеКП(б) аб нізавым друку, праверыць апэрацыйнасьць газэт у барацьбе за прамфінплян.

Для таго, каб газэта не цягнулася ў хвасьце, не фіксавала факты, а была-б баявым апэрацыйным органам, арганізатарам мас, здольным своячасова мабілізаваць на канкрэтных вучастках барацьбы за прамфінплян, яна павінна прытрымлівацца не бяззубай самакрытыкі, не гаварыць «з поўголасу», а мець сьмеласьць рашуча, па-бальшавіцку ставіць пытаньні, павінна ўмець барацьбу з асобнымі на даны пэрыяд часу важнейшымі вытворчымі недахопамі узьнімаць на належную прынцыповую вышыню. У гэтым павінна дапамагаць ёй партарганізацыя і ўся пралетарская грамадзкасьць.

Апошні нумар шматтыражнай газэты заводу **«Камунар»** (Менск) ад 18 мая г.г. паказвае, што на такі шлях газэта пачынае станавіцца.

На заводзе «Камунар» — глыбокі прарыў. Прамфінплян за першы квартал 1931 г. выканан толькі на 73%, а за красавік — на 53%. Сабекошт зьніжан у першым квартале замест 13 проц. толькі на 2,9 проц.

Бюро партыйнага калектыву заводу і нарада сакратароў цэх'ячэек у сваіх пастановах далі зусім правільны аналіз прычын прарываў. Вось вытрымкі з рэзалюцыі бюро парткалектыву: «Пагоршаньне якасьці прадукцыі, павялічэньне браку (ліцейны, такарны, кавальскі, мэханічна-зборачны цэхі) можа быць растлумачана толькі нядбайнасьцю кіраўніцтва цэхаў як па партыйнай лініі, так і па гаспадарчай. Пытаньнем выкананьня праграмы на якасьці «трыкутнікі» не займаюцца, што па сутнасьці справы прыяло да павялічэньня браку, падаражаньня сабекошту і г. д. З працыдысцыплінай у асобных групах рабочых справа вельмі дрэнная. Прагулы, сымулянства, гультайства не сустракаюць належнага адпору з боку цэхарганізацый. Пляна васьць як агульна-заводзкая, так і цэхавая наладжана вельмі дрэнна... Нежаданьне па-бальшавіцку ўзначаліць работу і кіраўніцтва ў цэхах назіраецца і на сёньнешні дзень з боку цэхавых «трыкутнікаў».

А нарада сакратароў цэхавых парт'ячэек у сваёй пастанове сказала: «За апошнія месцы сацспаборніцтва і ўдарніцтва значна аслабла. Асноўная прычына гэтаму — бязьдзейнасьць цэхавых арганізацый у гэтым пытаньні».

Заводзкая шматтыражка «Камунаравец» зусім правільна зрабіла, выступіўшы з рэзкім перадавым артыкулам, які цалкам пабудаваны ў духу пастаноў парткалектыву і нарады сакратароў цэхавых парт'ячэек, зьмясьціўшы пры гэтым рад канкрэтных матар'ялаў, якія выкрываюць слабыя месцы вытвор часьці і канкрэтных вінаватых, мабілізаваўшы рабочых на барацьбу супроць прарыву.

Над матар'яламі на першай старонцы газэта дала «шапку»: «Плянаваньне — вузкае месца нашага заводу «Камунар». Вялізарны прарыў — вынік няўвязкі работы цэхаў і брыгад, невыстарчальнага ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку, гаспадарчага адзіначальня, кепскага кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, аслабленьня рэалізацыі рабочых прапаноў, заняпаду працдысцыпліны, росту прагулаў. Арганізацыі заводу не стаяць на чале творчай актыўнасьці рабочай масы. Пакончыць з апартуністычным самацёкам, да 1-га чэрвеня ліквідаваць прарыў».

Не зразумеўшы добра сэнсу гэтай «шапкі», «трыкутнік» заводу ўгледзеў у ёй процістаўленьне кіраўніцтву заводу і на аснове гэтага ўжыў недапушчальныя меры рэагаваньня, перайшоўшы да бяспрынцыпнай лаянкі з рэдактарам шматтыражкі, а сакратар парткалектыву дапусьціў грубейшую палітычную памылку, прапанаваўшы **затрымаць рассылку газэты па сельскіх і менскіх установах** да вырашэньня пытаньня бюро парткалектыву.

Бюро гаркому КП(б)Б, якое ўчора спэцыяльна разглядала гэта пытаньне, зусім правільна кваліфікавала гэты факт, як **просты заціск самакрытыкі.** Замест аб'яднаньня сіл, каб даць рашучы бой канкрэтным вінаватым у прарыве і ўзяцца па-бальшавіцку за ліквідацыю прарыву, «трыкутнік» аслабіў увагу да вытворчых пытаньняў, замяшаўшыся ад зусім правільнай крытыкі газэты.

Прыкры факт заціску самакрытыкі на заводзе **«Камунар»** сыгналізуе аб тым, што ня ўсюды яшчэ ўсьвядомлена палітычная важнасьць бальшавіцкай самакрытыкі, ня ўсюды ўсьвядомлена пастанова ЦК УсеКП(б) аб рабселькораўскім руху і нізавым друку. Таму гарком КП(б)Б у сваёй пастанове і завастрае ўвагу ўсёй гарадзкой партыйнай арганізацыі на памянёных фактах заціску самакрытыкі і прапануе «выкарыстаць месячнік друку для яшчэ большага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, для выяўленьня і барацьбы супроць зажымшчыкаў самакрытыкі, для ўзмацненьня парткіраўніцтва нізавым друкам і рабкораўскім рухам». Выкананьне гэтай пастановы павінна забясьпечыць узьняцьце новай хвалі бальшавіцкай самакрытыкі і канкрэтызацыі партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам.

Бюро парткалектыву заводу «Камунар» павінна неадкладна выканаць пастанову гаркому аб узмацненьні кіраўніцтва і дапамогі шматтыражцы ў яе рабоце па мабілізацыі мас на ліквідацыю прарыву, забясьпечыўшы шырэйшае разгортваньне самакрытыкі, ня гледзячы на асобы.

Няма сумненьня, што партыйны калектыў заводу «Камунар», у асноўным здаровы калектыў, які ня раз паказваў узоры бальшавіцкай работы, разгорне ўзмоцненую барацьбу за ліквідацыю прарыву, за выкананьне і перавыкананьне пляну, што ён мэтадам шырокай самакрытыкі бязьлітасна выкрые і зьнішчыць перашкоды на гэтым шляху.

Пастанова бюро гаркому КП(б)Б

аб грубейшым заціску самакрытыкі на зав. „Камунар"

1. Бюро Гаркому КП(б)Б адзначае зусім недапушчальныя формы рэагаваньня «трыкутніка» заводу «Камунар» на зьмест «шапкі» ў газэце «Камунаравец» № 8 ад 18 мая. «Шапка» газэты — «Заводзкія арганізацыі не стаяць на чале актыўнасьці мас. Пакончыць з апартуністычным самацёкам» — **адпавядае зусім правільным пастановам бюро парткалектыву і нарады сакратароў цэх'ячэек ад 5 мая г.г., дзе прычыны** прарываў на заводзе тлумачацца слабой работай нізавых «трыкутнікаў», у выніку чаго аслабла сацспаборніцтва, павялічыўся брак, прагулы, няма пляновасьці і г.д.

2. «Трыкутнік» замест таго, каб дапамагчы рэдкалегіі мабілізаваць увагу рабочага калектыву на ліквідацыю прычын прарыву, на перабудову работы фабрычна-заводзкіх арганізацый, угледзеўшы ў фармулёўцы газэты абвінавачаньне кіраўніцтва заводу (бюро парткалектыву, заўкому дырэктара), зусім **няправільна** рэагаваў на гэта.

3. Сакратар парткалектыву дапусьціў **грубейшую палітычную памылку,** прапанаваўшы **затрымаць** да пастановы нечарговага бюро парткалектыву рассылку памянёнага нумару шматтыражкі ў сельскія і менскія установы.

Ўсё гэта нельга інакш кваліфікаваць як **просты заціск самакрытыкі.**

4. Прыняць да ведама заяву сакратара парткалектыву тав. Марковіча аб поўным прызнаньні ім дапушчанай палітычнай памылкі.

5. Прапанаваць «трыкутніку» заводу прыняць рад рашучых мерапрыемстваў па ўзмацненьні кіраўніцтва і дапамогі шматтыражцы ў разгортваемай ёю рабоце па мабілізацыі мас на ліквідацыю прарыву на заводзе, садзейнічаючы пашырэньню пралетарскай самакрытыкі.

6. Бюро Гаркому КП(б)Б завастрае ўвагу ўсёй гарадзкой партыйнай арганізацыі на фактах грубейшага заціску самакрытыкі з боку «трыкутніка» заводу «Камунар». Бюро Гаркому прапануе ўсім гарадзкім парт'ячэйкам выкарыстаць месячнік друку для яшчэ большага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, для выяўленьня і барацьбы супроць зажымшчыкаў самакрытыкі, для ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабкораўскім рухам.

Рабочыя заводу імя Варашылава выклікаюць:

ВСНГБ, Дзяржплян, Нарказем, Калгасцэнтр, ІТР і Таварыства аграрнікаў-марксыстаў

прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні ўсебеларускага зьезду рабселькораў

Агульны сход рабочых чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава горача вітае надыходзячы ўсебеларускі зьезд рабселькораў і шле гарачае бальшавіцкае прывітаньне кіраўніку рабселькораўскага руху па БССР — ЦК КП(б)Б і яго баявому цэнтральнаму органу — газэце «ЗЬВЯЗДА», а таксама газэце рабселькораў — «РАБСЕЛЬКОР».

Агульны сход рабочых аднагалосна пастанаўляе вылучыць для непасрэднай актыўнай практычнай дапамогі сэкцыі мэталяпрацоўчых прадпрыемстваў усебеларускага зьезду рабселькораў наступную групу рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў:

1. РУБІНШТЭЙН — рабкор-ударнік; 2. МІНЬКОЎ — тэхнік; 3. АДЫНЕЦ— рабкор-ударнік і 4. ХАРНАС — работнік бюро рабочага вынаходзтва.

Агульны сход рабочых абавязвае вышэйпералічаных т. т. прыняць самы непасрэдны ўдзел як асабліва ў падрыхтоўчай, так і ўнепасрэднай работы ўсебеларускага зьезду.

**Агульны сход рабочых заводу імя Варашылава ВЫКЛІКАЕ СЭКЦЫЮ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ СІЛ ПРЫ ЦСПСБ, СТАРШЫНЮ ДЗЯРЖПЛЯНУ тав. ГОЛЬДБЭРГА і СТАРШЫНЮ ВСНГБ тав. ГРЫСЕВІЧА выслучыць ня менш 30-ці інжынэрна-тэхнічных і гаспадарчых работнікаў (у

Барацьба за фінплян—неадлучная частка барацьбы за пяцігодку за 4 га

Сацспаборніцтва, ударніцтва, фінансавая дысцыпліна

ВЫРАШАЮЦЬ ЛЁС ФІНПЛЯНУ ДРУГОГА КВАРТАЛУ

На 10 мая плян выканан толькі на 27,7 проц.

Гарадоцкі, Смалявіцкі, Чавускі, Бялыніцкі, Чачэвіцкі, Расьнянскі, Шклоўскі, Лагойскі, Чэрэйскі, Хойніцкі, Талачынскі, Сеньненскі, Азарыцкі, Нараўлянскі, Старобінскі і Асьвейскі раёны ганебна цягнуцца ў хвосьце

Неадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы. Неаслабнай барацьбой з апартуністычнай практыкай забясьпечыць поўнае выкананьне пляну

Камсамол—актыўны змагар за фінплян!

Гомельскі камсамол выклікаў Менскую арганізацыю ЛКСМБ на сацспаборніцтва на лепшы ўдзел у мабілізацыі сродкаў насельніцтва

Гомельскі гарадзкі камітэт ЛКСМБ абвясьціў з 15 па 25 мая дэкаду штурму прарываў у мабілізацыі сродкаў насельніцтва. У гэту дэкаду камсамол Гомеля абавязаўся ліквідаваць прарывы ў выкананьні фінпляну за першы квартал красавіка і першую палову мая, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну другога кварталу.

Ужо першыя тры дні штурму далі значны зрух у выкананьні фінпляну. За тры дні ашчадкасы ўцягнулі новых укладаў на 27.000 руб. На рымарным заводзе ўцягнута ўкладаў на 1.400 руб., на фабрыцы «Казімі» на 1.100 руб., камсамольскі калектыў Гомсельмашу ўцягнуў у ашчадкасы 117 новых укладчыкаў, камсамольскія брыгады рымарнай фабрыкі—30 укладчыкаў, на фабрыцы імя Клары Цэткін уцягнута новых укладаў на 1,125 руб. і г. д.

Гомельскі гарком ЛКСМБ правёў рад мерапрыемстваў для ўзмацненьня барацьбы за фінплян. 30 камсамольцаў-брыгадзіраў вылучаны для правядзеньня работы на прадпрыемствах. 10 камсамольцаў выехалі ў вёску для дапамогі мясцовым ячэйкам у мабілізацыі сродкаў насельніцтва. 5 камсамольцаў вылучаны і ўжо працуюць на пастаяннай рабоце ў ашчадкасах.

13-га мая адбыўся сход актыву гарадзкой камсамольскай арганізацыі, на якім прысутнічала 400 чал. Сход зацьвердзіў плян удзелу гарадзкой арганізацыі камсамолу ў мабілізацыі сродкаў.

Камсамол Гомеля ўзяў на сябе наступныя абавязкі:

завербаваць сіламі камсамольскіх ячэек новых укладаў у ашчадкасы на працягу маю ахапіць ашчадкасамі ўсе 100 проц. камсамольцаў.

на працягу мая ахапіць ашчадкасы 300.000 руб.;

Гэту работу праводзіць пад лёзунгам: «Кожнаму камсамольцу — ашчадную кніжку». Кожны камсамолец павінен уцягнуць у ашчадкасы ня менш трох укладчыкаў;

адкрыць тры камсамольскія ашчадкасы; вылучыць 30 камсамольцаў на пастаянную работу ў ашчадапарат;

арганізаваць камсамольскую ячэйку пры ашчадкасе;

мабілізаваць камсамольскі актыў вакол ашчадсправы. На кожным прадпрыемстве павінна быць ня менш аднаго камсамольца ў камісіі садзейнасьці і адзін—у якасьці грамадзкага інструктара па ашчадсправе і пазыкі.

Ячэйкі камсамолу арганізуюць шэфства над ашчадкасамі, прычым ячэйка-шэф нясе адказнасьць за работу і выкананьне фінпляну падшэфнай ашчадкасай.

Сход актыву пастанавіў выпусьціць газэту - шматтыражку, прысьвечаную ўдзелу камсамолу ў мабілізацыі сродкаў насельніцтва і сыстэматычна асьвятляць гэту работу ў цэнтральных і раённых газэтах.

Да ўдзелу ў мабілізацыі сродкаў прыцягваецца таксама піянэрская арганізацыя. Піянэры арганізуюць брыгады па вярбоўцы ўкладчыкаў у ашчадкасы, рэалізацыі пазыкі, праверцы па жактах свайчасовасьці ўплаты жыхарамі платы за кватэру, электрычнасьць, ваду і інш.

Вылучаны 5 прэмій для камсамольскіх ячэек і піянэрарганізацый за лепшае правядзеньне работы па мабілізацыі сродкаў і поўнае выкананьне фінпляну.

Гомельскі камсамол выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва Менскую камсамольскую арганізацыю на лепшае правядзеньне мабілізацыі сродкаў, лепшы ўдзел у барацьбе за фінплян.

***

САКРАТАР МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЛКСМБ ТАВ. ЯНКОВІЧ У ГУТАРЦЫ З НАШЫМ СУПРАЦОЎНІКАМ ПАВЕДАМІЎ НАСТУПНАЕ:

БЮРО МЕНГАРКОМУ КАМСАМОЛУ 20 МАЯ, АБГАВАРЫВАЮЧЫ ВЫКЛІК ГОМЕЛЬСКАЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ПАСТАНАВІЛА: ВЫКЛІК ПРЫНЯЦЬ.

БЮРО РАСПРАЦАВАЛА РАД КАНКРЭТНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ЎЗМАЦНЕНЬНІ ЎДЗЕЛУ КАМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК МЕНСКУ Ў МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА. НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ НАЗАД МЕНСКІ КАМСАМОЛ ЗАКЛЮЧЫЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР З ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ НА ЛЕПШЫ ЎДЗЕЛ У БАРАЦЬБЕ ЗА ФІНПЛЯН. БЮРО ГАРКОМУ ПАСТАНАВІЛА ДАСТАСАВАЦЬ РАСПРАЦАВАНЫ ТАДЫ КАНКРЭТНЫ ПЛЯН ДЗЕЯНЬНЯЎ І У САЦСПАБОРНІЦТВЕ З ГОМЕЛЬСКІМ КАМСАМОЛАМ.

Фінплян... на апошнім пляне

(Ад нашага карэспандэнта)

Мабілізацыя сродкаў па Койданаўскім раёне праходзіць вельмі нездавальняюча. Раённыя фінорганы замест таго, каб па-баявому ўключыцца ў работу па мабілізацыі сродкаў, спадзяюцца на самацёк, не вядуць рашучай барацьбы за фінплян. У выніку плян мабілізацыі сродкаў сыстэматычна зрываецца.

Спажывецкая каапэрацыя недавыканала пляну збору паявых узносаў за мінулы квартал на 27.000 руб. Аднак, гэты прарыў не паслужыў сыгналам для ўзмацненьня работы ў далейшым. Заданьне на красавік таксама сарвана—сабрана паявых узносаў толькі 43,3 проц. пляну.

Райкалгассаюз ня ўжыў ніякіх мер для забесьпячэньня пасьляховага збору ўступных і мэтавых узносаў у калгасы. Ён абмежаваўся толькі рассылкай па калгасах і сельсаветах заданьняў. Праверкай выкананьня сваіх дырэктыў калгассаюз не заняўся.

Месячны плян мабілізацыі сродкаў за красавік выканан па раёне толькі на 55 проц.

Асабліва дрэнна праходзіць работа па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. Мясцовыя арганізацыі зусім недаацэньваюць значэньня будаўніцтва МТС і літаральна нічога ня робяць для рэалізацыі акцый. Калгасы «Ленінскі шлях», «Чырвоная зорка», імя Калініна, «Чырвоны араты», імя Варашылава, імя Дзяржынскага, «Навасады», «Чырвоная зьмена», імя Фрунзэ, «Бальшавік», «Чырвоны прамень» і «Чырвоны Кастрычнік» да гэтага часу не рэалізавалі ні адзай акцыі Трактарацэнтру. Рад калгасаў рэалізаваў на зусім нязначную суму. Так, калгас «Пралетары» замест 800 руб., вызначаных плянам, рэалізаваў толькі на 100 руб., калгас «Прафінтэрн» замест 1.000—на 120 руб., калгас «Перамога» замест 400 руб.—на 50 руб. г. д.

У выніку гэтай недапушчальнай бязьдзейнасьці, поўгадовы плян рэалізацыі акцый Трактарацэнтру выканан па сёнешні дзень толькі на 36 проц. Кіруючыя работнікі райкалгассаюзу лічаць рэалізацыю акцый справай выключна МТС.

Ашчадкаса раёну ўсё яшчэ не павярнулася тварам да вёскі. Ня гледзячы на рад дырэктыў вышэйшых органаў, ашчадкаса да гэтага часу не адкрыла аддаяленьня ні ў адным сельсавеце.

Неабходна зараз-жа дабіцца пералому ў мабілізацыі сродкаў па Койданаўшчыне. Апартуністычная недаацэнка гэтай важнейшай справы павінна сустрэць руйнуючы адпор.

С.

Чорная дошка

раёнаў, якія ганебна правальваюць плян мабілізацыі сродкаў

НАЗВА РАЁНАЎ	Процант выкананьня пляну другога кварталу на 10 мая
Гарадоцкі	9,9
Смалявіцкі	11,1
Чавускі	11,7
Бялыніцкі	14,0
Чачэвіцкі	14,5
Расьнянскі	15,3
Шклоўскі	15,6
Лагойскі	15,7
Чэрэйскі	16,0
Хойніцкі	16,1
Талочынскі	16,1
Сененскі	16,3
Азарыцкі	16,7
Нараўлянскі	17,1
Старобінскі	17,3
Асьвейскі	17,4

Там, дзе барацьбы за фінплян ня было

ШКЛОЎ.

Прэзыдыум шклоўскай РКК-РСІ заслухаў даклад аб ходзе мабілізацыі сродкаў насельніцтва па раёне. Прэзыдыум адзначыў недапушчальна марудныя тэмпы гэтай кампаніі. Плян другога кварталу выканан толькі на 16,7%.

Райкалгассаюз, ня гледзячы на шматлікія дырэктывы вышэйшых органаў, да гэтага часу ня прыняў мер для ўзмацненьня работы па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. Ніякага зруху ў гэтай справе яшчэ няма.

Сыстэма райспажыўсаюзу пляцецца ў хвасьце барацьбы за фінплян. На 10 мая плян мабілізацыі сродкаў выканан: па паявых узносах на 10%, па мэтавых укладах на 13,5%.

Ашчадкасы з бязьдзейнічаюць. За апошні час ня толькі ня ўцягнута новых укладаў, але, наадварот, меў месца значны адліў.

Гарсавет, сельсаветы на мясцох, райпрафсавет не прынялі ніякіх мер для ўзмацненьня рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», не мабілізавалі шырокіх мас вакол гэтай важнейшай кампаніі.

РайКК РСІ абвясьціла суровую вымову праўленьню райкалгассаюзу за бязьдзейнасьць і невыкананьне дырэктыў вышэйшых партыйных і савецкіх органаў аб узмацненьні мабілізацыі сродкаў.

Праўленьню райспажыўсаюзу пастаўлена на від слабае кіраўніцтва нізавой сеткай, невыстарчальная работа па мабілізацыі сродкаў.

Дырэктару МТС тав. Кляшчову за слабую рэалізацыю акцый Трактарацэнтру абвешчана вымова.

Мабілізацыі сродкаў—нуль увагі

МАЗЫР.

На фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» мабілізацыі сродкаў зусім не аддаецца ўвага. Жакт, які існуе пры фабрыцы, мае сыстэматычную запазычанасьць па кватэрнай плаце. На сёнешні дзень гэта запазычанасьць складае звыш 800 руб. Праўленьне жакту ня цікавіцца гэтым пытаньнем і ня ўжывае мер да спагнаньня запазычанасьці з жыхароў. Сам старшыня праўленьня мае запазычанасьць па кватэрнай плаце за 4 месяцы.

Вялікая запазычанасьць ёсьць і па пазыцы «Пяцігодка—за чатыры гады». Рад рабочых, якія падпісаліся на пазыку, да гэтага часу ня ўнесьлі яшчэ грошай. Некаторыя рабочыя перавяліся на іншую працу і не ліквідуюць запазычанасьці па пазыцы.

ЯРГОЛІН.

Пасяджэньне калегіі наркамфіну на заводзе імя Варашылава

У мэтах найбольшага набліжэньня работы Наркамфіну да шырокіх мас рабочых, Калегія Наркамфіну пастанавіла праводзіць пэрыядычна свае пасяджэньні непасрэдна на вытворчасьці. Першае такое пасяджэньне адбылося 20-га мая НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, які шэфствуе над апаратам НКФ. На парадку дня стаялі наступныя пытаньні: даклад цэнтральнага кіраўніцтва ашчадкас і дяржкрэдыту і суаклад ашчадкасы заводу імя Варашылава аб выкананьні прамфінпляну.

Пасяджэньне прайшло пры актыўным удзеле рабочых мас заводу. Рабочыя выказалі пажаданьне, каб такія пасяджэньні непасрэдна на вытворчасьці практыкаваліся і надалей.

Радыё-пераклічка аб мабілізацыі сродкаў

25 мая, ад 6 да 8 гадзін вечара Наркамфін БССР арганізуе радыё-пераклічку па пытаньні аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў другога кварталу. Уступнае слова зробіць наркамфін БССР тав. Хацкевіч. Будуць заслуханы даклады Гомельскага гарфа, Мазырскай ашчадкасы, Магілеўскага райфа, Бабруйскага райкому ЛКСМБ, Віцебскага гарпрафсавету, Аршанскага райспажыўсаюзу, Барысаўскага райкалгассаюзу. З прамовамі выступяць таксама прадстаўнікі ЦПСПБ, Белкалгасцэнтру, ЦК ЛКСМБ і старшыня Белкаапсаюзу тав. Хаськін.

У нізавых ячэйках

— Прафарганізацыя Вульскага раёну яшчэ не перабудавала сваёй работы. Не наладжана абслугоўваньне сезоньнікаў. Ніякага кіраўніцтва сацспаборніцтвам няма. Культмасавай работы не вядзецца. Партарганізацыя не рэагуе на гэта. Лепшыя работнікі рабачкому дарожнага будаўніцтва перакінуты на іншую работу. Апрача прыёму членскіх узносаў, ніякай работы рабачком не праводзіць.

Сьвярчок.

— Бягомльскі райпрафсавет яшчэ не павярнуўся тварам да вытворчых задач. Рэарганізацыя праходзіць чарапашымі тэмпамі. Культмазавая работа кульгае. Ня гледзячы на тое, што савецкі апарат засьмечан клясава-варожымі элемэнтамі, аб чым ня раз сыгналізавалі газэты, райпрафсавет ніякіх мер да ачысткі яго ня прымае.

Рад устаноў (райкаапсаюз і інш.) да гэтага часу не заключылі калектыўных умоў на работнікаў.

Брыгадзір ВІР.

АГЛЯД ДРУКУ

Памылкі і маўчаньне ў важнейшым пытаньні

(„Калгасьнік Беларусі", „Камунар Магілеўшчыны" і „Бальшавік Барысаўшчыны"

Новы закон аб с.-г. падатку мае гігантскае палітычнае значэньне. Ён зьяўляецца магутнай зброяй сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Найшырэйшая папулярызацыя новага закону—адна з важнейшых умоў далейшых посьпехаў у барацьбе за нарастаньне тэмпаў калектывізацыі. «Зьвязда» яшчэ 2 красавіка пісала:

«...Партыйныя арганізацыі павінны бездакладна бальшавіцкімі тэмпамі правесьці шырокую агітацыйна-растлумачальную кампанію аб новым законе пра с.-г. падатак».

Растлумачыць новы закон аб с.-г. падатку, давесьці яго да калгасных і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас, сварыстаць яго для фарсаваньня тэмпаў другой бальшавіцкай сяўбы і арганізацыі новага калгаснага прыбою—баявая першачарговая задача. За яе ажыцьцяўленьне друк нясе непасрэдную адказнасьць.

***

«КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ» — цэнтральная калгасная газэта БССР. Зусім відавочна, што яна першай павінна была разгарнуць баявую масавую кампанію вакол новага закону аб с.-г. падатку, азнаёміць з ім кожнага калгасьніка і аднаасобніка. Ці зрабіла гэта газэта? Прагляд камплектаў «Калгасьніка Беларусі» за красавік і першую палову мая гаворыць НЕ на карысьць рэдакцыі.

Мала таго, што «Калгасьнік Беларусі» за гэты час амаль зусім не даваў разгорнутых матар'ялаў, якія-б папулярызавалі новы закон аб с.-г. падатку. У тых адзінкавых артыкулах па гэтым пытаньні, якія зьмясьціла газэта на сваіх старонках, рэдакцыя дапусьціла шмат няправільных і палітычна-шкодных установак. Іншымі словамі газэта ня толькі зусім невыстарчальна растлумачыла новы закон аб с.-г. падатку, але і дапусьціла пры гэтым грубыя палітычныя памылкі.

Апублікаваўшы палажэньне аб с.-г. падатку, «Калгасьнік Беларусі» 6 красавіка зьмясьціў спэцыяльны рэдакцыйны артыкул. Мэта артыкулу, мяркуючы па яго зьмесьце—растлумачыць калгасным і аднаасобным бядняцка-серадняцкім масам новы закон аб с.-г. падатку. Аднак, як ажыцьцёўлена гэта мэта.

Артыкул не папулярызуе новы закон, а проста дэзарыентуе чытача. Чаго, чаго, а няправільных блытаных установак у артыкуле нямала.

«Мы зараз маем у калгасах СССР 10 млн., а ў калгасах БССР звыш 160 тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. ВЫХОДЗЯЧЫ З ГЭТАГА, новы закон аб с.-г. падатку прадугледжвае абкладаньне падаткам калектыўных гаспадарак, неабагуленых да ходаў калгасьнікаў і абкладаньне аднаасобнікаў».

Выходзіць, што калі процант калектывізацыі быў-бы большым ці меншым, тады падаткам абкладаліся-б ня ўсе гэтыя групы. Так, ці што? Установка блытаная і няправільная.

Далей, у гэтым-жа артыкуле рэдакцыя «Калгасьніка Беларусі» піша:

«...у аднаасобных гаспадарках, асабліва ў заможна-кулацкіх разьмер падатку прагрэсыўна ўзрастае разам з ростам даходу і дасягае ад 4 да 50 кап. з кожнага рубля даходу, а па кулацкіх—ад 20 да 70 кап. з рубля».

Ня трэба даводзіць, што гэта яўная блытаніна. Але блытаніна шкодная. У новым законе аб с.-г. падатку выразна паказана, што ад 4 да 30 кап. абкладаюцца серадняцкія гаспадарні, а ад 20 да 70 кап. кулацкія. Газэта-ж адным росчаркам пяра механічна адносіць серадняцкія гаспадаркі пад рубрыку заможна-кулацкіх. Ці ня ясна, што «установкі» падобнага роду па сутнасьці справы зьяўляюцца шкоднай палітычнай памылкай.

Новы закон аб с.-г. падатку зьяўляецца магутным вагаром пасьпяховага правядзеньня кантрактацыі і загатовак. «Калгасьнік Беларусі» гэта павінен быў падкрэсьліць з асаблівай сілай. Аднак, у артыкуле, які цытуецца намі, рэдакцыя гэтага не зрабіла. Больш таго, «Калгасьнік Беларусі» і тут дае няправільную ўстаноўку. Рэдакцыя памылкова растлумачвае парадак абкладаньня даходаў ад продажу прадуктаў па павышаных цэнах:

«У сувязі з тым, што кошт прадукцыі сельскай гаспадаркі на прыватным рынку значна вышэй дзяржаўных і каапэрацыйных цэн, закон аб падатку на 1931 г. прадугледжвае АБКЛАДАНЬНЕ Ў АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ даходаў, якія атрыманы ад продажу прадуктаў упаснай гаспадаркі па цэнах, павышаных супроць дзяржаўных і каапэрацыйна-загатоўчых цэн».

І так рэдакцыя сьцьвярджае, што абкладацца будуць даходы (ад продажу с.-г. прадуктаў па павышаных цэнах) усіх аднаасобных гаспадарак. Такое тлумачэньне няправільнае і палітычна-шкоднае. Рэдакцыя павінна была падкрэсьліць, што гэтыя даходы НЯ БУДУЦЬ абкладацца ў тых гаспадарках, якія поўнасьцю выконваюць плянавыя заданьні па загатоўках і кантрактацыйныя дагавары.

Рэдакцыя «Калгасьніка Беларусі» успамінае аб новым законе пра с.-г. падатак толькі ад выпадку да выпадку. Мы прагледзілі ў хранікалёгічным парадку №№ «К. Б.» ад 1 красавіка да 16 мая (за выключэньнем 45, 55 і 57). За ўвесь гэты час рэдакцыя зьмясьціла толькі адзін артыкул Наркамфіну. Больш ні аднаго радка. Нельга не падкрэсьліць, што цэлы рад артыкулаў газэты аб калектывізацыі і пасеўнай кампаніі і г. д. зусім ня зьвязан з новым законам аб с.-г. падатку. Рэдакцыя забыла, што папулярызацыю новага закону трэба ў першую чаргу падпарадкаваць задачам барацьбы за посьпех веснавой сяўбы і тэмпаў калгаснага прыліву.

Газэта абавязана неадкладна ВЫПРАВІЦЬ усе гэтыя грубыя палітычныя памылкі. «Калгасьнік Беларусі» павінен на-ходу перабудавацца і па-бальшавіцку разгарнуць найшырэйшую растлумачальную работу вакол новага закону аб с.-г. падатку.

***

«КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ» паказвае прыклад зусім нецярпімага ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду аб папулярызацыі новага закону пра с.-г. падатак. Дарэмна шукаць на старонках «Камунара Магілеўшчыны» хаця-б якібудзь намёк на масавую агітацыйна-растлумачальную работу вакол новага закону.

На працягу красавіка і першай паловы мая газэта толькі адзін раз успомніла пра с.-г. падатак. Па гэтым пытаньні «Камунар Магілеўшчыны» зьмясьціла невялікую падборку 6-ці красавіка. У тым-жа нумары рэдакцыя прысьвяціла с.-г. падатку і свой перадавы артыкул. Але ён посіць агульны пекапкрэсны характар. Газэта не мабілізуе мясцовых Магілеўскага раёну, а гаворыць «наагул». Пасьля 6 красавіка па працягу цэлых чатырох дэкад «Камунар Магілеўшчыны» ні адным словам ня ўспомніў пра новы закон, калі ня лічыць афіцыйнай пастановы Магілеўскага РІКа, зьмешчанай у газэце без усякіх камэнтараў з боку рэдакцыі.

Газэта правяліла НЕДАПУШЧАЛЬНУЮ НЕДААЦЭНКУ палітычнага значэньня новага закону аб с.-г. падатку. На палітычны дакумант, які адыгрываў вялікую ролю ў барацьбе за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы і далейшае разгортваньне калектывізацыі, газэта адказала маўчаньнем. Апартуністычная памылка рэдакцыі павінна быць неадкладна выпраўлена.

***

«БАЛЬШАВІК БАРЫСАЎШЧЫНЫ» пасьледаваў прыкладу «Камунара Магілеўшчыны». Ён ня даў ні аднаго артыкулу, які-б у простай і зразумелай форме растлумачваў сутнасьць і значэньне новага закону калгасным і аднаасобным бядняцка-серадняцкім масам. Праўда, у красавіку газэта зьмясьціла адзін артыкул пад загалоўкам «Па-бальшавіцку правядзем с.-г. падаткавую кампанію». Але гэты артыкул зусім ня грунтуецца на мясцовых умовах і складаецца з адных агульных фраз. Мала таго, у артыкулу дапушчаны нявыразныя памылковыя фармулёўкі. У пытаньнях абкладаньня кулацкіх гаспадарак рэдакцыя дае палітычна - шкодныя ўстаноўкі. У артыкуле бярэцца курс на «ПАДАЎЛЕНЬНЕ ЭКАНАМІЧНАЙ МАГУТНАСЬЦІ КУЛАЦТВА». Паводле газэты значыць трэба не змагацца за ліквідацыю кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі, а толькі... падавіць эканамічную магутнасьць кулака. Нічога агульнага з лініяй партыі такая ўстаноўка НЯ МАЕ.

Акрамя гэтага памылковага і палітычна-шкоднага артыкулу газэта больш не зьмясьціла ні аднаё заметкі аб новым законе пра с.-г. падатак.

***

«КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ», «БАЛЬШАВІК БАРЫСАЎШЧЫНЫ», «КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ» абавязаны зараз-жа выправіць свае памылкі, адзначаныя намі. Іх баявая задача—баявым тэмпам разгарнуць масавую найшырэйшую папулярызацыю новага закону пра с.-г. падатак. Газэты павінны сыстэматычна асьвятляць як разгортваецца с.-г. падатковая кампанія. Яны павінны рашуча змагацца з усякімі фактамі парушэньня новага закону, а правазапартуністычнымі скажэньнямі ў практыцы с.-г. падатковай кампаніі і «левымі» загібамі. «Калгасьнік Беларусі», «Бальшавік Барысаўшчыны» і «Камунар Магілеўшчыны» павінны арганічна злучыць папулярызацыю новага закону з барацьбой за тэмпы сяўбы, за далейшы ўздым калгаснага прыліву, за баявое правядзеньне ўсіх відаў загатовак і выкананьне пляну кантрактацыі яравых пасеваў. Гэтыя-ж задачы зьяўляюцца баявымі задачамі і ўсяго нізавога друку.

Усесаюзнай качагарцы—рабочыя рукі!

ВЯРБОЎКА БЫЛЫХ ГАРНЯКОЎ НЕ РАЗГАРНУЛАСЯ. БЕЛКАЛГАСЦЭНТР, НАРКАМПРАЦЫ І ЦК ЛКСМБ СЛАБА КІРУЮЦЬ ВЯРБОВАЧНАЙ КАМПАНІЯЙ

Брыгадзірам на мясцох не аказваецца поўнага падтрыманьня

УДАРЫЦЬ ПА КУЛАКУ, ЯКІ ІМКНЕЦЦА САРВАЦЬ ПЛЯНЫ ВЯРБОЎКІ

Да першага чэрвеня даць Данбасу 5.000 былых гарнякоў

Перабудаваць работу

Да 1 чэрвеня БССР павінна даць Данбасу 5.000 былых гарнякоў. З іх Белкалгасцэнтр абавязан завербаваць па калгасным сэктары 2.280 чал. Завербавана-ж на сёнешні дзень усяго толькі 250 чал., прычым па калгасах толькі 10.

Плян па вярбоўцы рабочай сілы для каменнавугальнай прамысловасьці пастаўлен пад сур'ёзную пагрозу зрыву.

Прадстаўнікі Данбасу не атрымліваюць ніякай канкрэтнай дапамогі з боку некаторых цэнтральных органаў. Ім прыходзіцца па некалькі раз хадзіць у БЕЛКАЛГАСЦЭНТР І ЦК ЛКСМБ і назат упрашаць іх даць дырэктывы па пытаньні дапамогі вярбоўшчыкам из мясцох. Але, калі і ўдаецца дабіцца пасылкі дырэктыў, ніхто не правярае, як гэтыя дырэктывы выконваюцца. Ні ў ЦК камсамолу, ні ў Белкалгасцэнтры ня ведаюць, як праходзіць вярбоўка на мясцох.

Невыстарчальна дапамога вярбоўцы з боку НАРКАМПРАЦЫ, які пакуль што абмяжоўваецца «парадамі» аб тым, што каму трэба рабіць.

Дырэктывы партыі і ўраду па пытаньні вярбоўкі рабочай сілы Данбасу сустракаюць у радзе раёнаў супраціўленьне з боку апартуністычных элемэнтаў. Аб гэтым сыгналізуюць рабочыя-вярбоўшчыкі з месц.

Мы патрабуем ад органаў, на якіх ускладзена правядзеньне вярбоўкі. перабудаваць сваю работу з тым, каб нападзіць апэрацыйнае кіраўніцтва месцамі.

У раёнах, вызначаных для вярбоўкі, гэта работа павінна разглядацца, як адна з асноўных задач партыйных, савецкіх і прафэсыянальна-гаспадарчых арганізацый.

Трэба мабілізаваць актыў на дапамогу вярбоўшчыкам. Неабходна прыцягваць да непасрэднага, больш актыўнага ўдзелу ў вярбоўцы РВК і сельсаветы. Трэба рашуча папажыць канец нездаровым тэндэнцыям да пераманьненьня рабочай сілы з аднэй арганізацыі ў другую.

Нельга ня бачыць таго, што вакол вярбоўкі разгортваецца вострая клясавая барацьба. Кулак прыкладае ўсе намаганьні да таго, каб сарваць выкананьне плянаў, распускаючы ўсякага роду правакацыйныя чуткі аб мнімых труднасьцях работы ў Данбасе. На жаль, кулацкая агітацыя ў радзе выпадкаў на мясцох не сустракае належнага выкрыцьця і адпору, што вельмі моцна б'е па вярбоўцы.

Даючы руйнуючы адпор усім падкопам клясавага ворага і яго агентам—апартуністам, мабілізуючы ўвагу шырокіх мас працоўных вакол вялізарнага гаспадарча-палітычнага значэньня вярбоўкі рабочай сілы для ўсесаюзнай качагаркі, вядучы барацьбу з канкрэтнымі фактамі апартуністычнай недаацэнкі гэтага пытаньня, бязьдзейнасьці і бюракратызму, — мы даб'емся карэннага пералому ў ходзе вярбоўкі, забясьпечым поўнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду.

Фокусьнікі з Гусарскага сельсавету

Прадстаўнік Горпаўскага рудакіраўніцтва — тав. Трусаў, прыбыўшы ў КЛІМАВІЦКІ РАЁН, перш за ўсё зьявіўся ў райкалгассаюз і папрасіў:

— Дапамажэце ў вярбоўцы рабочай сілы Данбасу.

— Са здавальненьнем пакажам вам, дзе ёсьць гарнякі. Едзьце ў Гусарскі сельсавет, там ёсьць вялікі калгас, там ёсьць і былыя гарнякі.

Трусаў паехаў. Ён зьявіўся ў сельсавет. Не пасьпеў як след расказаць, у чым справа, старшыня бярэ аловак і пачынае пісаць:

ДАВЕДКА.

Дана вярбоўшчыкам-шахцёрам у ліку трох асоб у тым, што Гусарскі сельсавет абавязваецца дапамагчы завербаваць 10 чал. з аднаасобнага сэктару. З калгаснага сэктару ніводна гэта завербавацьніводнага таму, што з калгасаў завербавана на торфзавод «Багонск» 86 чалавек. Праўленьне калгасу «Праўда» хадайнічае аб звароце гэтых людзей назад. Калі гэта ўдасца, мы 86 чалавек аддамо Данбасу.

Старшыня Гусарскага сельсавету (подпісь).

Такімі паперкамі сельсавет ня толькі не аказаў дапаміго вярбоўшчыкам, а, наадварот, падарваў іх работу. Адначасова старшыня сельсавету ўносіць дэзарганізацыю і ў работу торфзаводу. Сярод рабочых торфзаводу налічваецца ня больш 5 чалавек былых гарнякоў, а ў сельсавеце іх налічваецца звыш 50 чалавек. Замест таго, каб дапамагчы рабочым Данбасу ў вярбоўцы гарнякоў, старшыня сельсавету ўзьняў пытаньне аб звароце тых рабочых, якія ўжо працуюць на здабычы торфу.

Вось як адносяцца паасобныя арганізацыі да важнейшай справы, справы вярбоўкі рабсілы Данбасу. Замест дапамогі вярбоўшчыку, яго кідаюць з аднаго сельсавету ў другі, прычым часта туды, дзе няма былых гарнякоў. Апартуністы стараюцца адчапіцца выдачай даведак, што няма рабсілы ў раёне.

Цэнтральныя органы павінны правярыць, як выконваюцца іх дырэктывы на мясцох. Плян вярбоўкі павінен быць выканан у тэрмін.

ЗАБОЙШЧЫК А. К.

Гарняк — Шафраноўскі, былы бядняк-селянін, Касьцюковіцкага раёну, які зараз прыехаў у БССР вярбаваць гарнякоў для Данбасу.

У нізавых праф'ячэйках

* На цагельных №№ 1 і 8 і будаўніцтве цагельнага камбінату Будаб'яднаньня няма ніякай культурна-масавай работы. Вынікам гэтага і слабага кіраўніцтва рабачкому спаборніцтвам і ўдарніцтвам, зьяўляецца невыкананьне прамфінпляну, адсталыя настрої сярод рабочых, рвацтва, ніякая прадысцыпліна. На цагельных былі антысавецкія выступленьні клясавага ворага, якія не знайшлі належнага адпору з боку мясцовых арганізацый.

Г. ДОРСКІ.

* Фабком картоннай фабрыкі імя Вароўскага не перабудаваў сваёй работы. Вылучэнцам фабкам ніякая дапамогі не аказае ў работе. На працягу 3-х месяцаў сярод рабочых мэханічнай майстэрні і дровавозчыкаў, якія працуюць у дзень, не праводзілася ніякай масавай работы.

УДАРНІКІ.

* Прафарганізацыі Случчыны ніякага ўдзелу ў пасеўнай кампаніі на прымаюць. Не наладжана работа пават ў падшэфных калгасах.

Прафарганізацыі ня прыцягваюць да практычнай работы добраахвотнікаў. Культурна-масавая работа пастаўлена з рук вон дрэнна. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута паміж членамі прафсаюзаў. Прафарганізацыі ніякага ўдзелу ў барацьбе [illegible] прамфінпляну.

Затрыманьне замест заахвочаньня

Надзвычай дрэнна праходзіць вярбоўка рабсілы для Данбасу па БЯЛЫНІЦКІМ РАЁНЕ. Некаторыя сельсаветы, а таксама праўленьні калгасаў не выдаюць дакумантаў жадаючым ехаць па работу ў капальні. Старшыня райвыканкому адмовіўся даць указаньні сельсаветам, каб былых гарнякоў не затрымлівалі і свайчасова выдалі ім дакумапты.

Між іншым, пельга не адзначыць таго, што месьніцтва заядае многія арганізацыі раёну. Неабходна, нарэшце з гэтым пакончыць.

Ня ведаюць аб ільготах

Па ДРЫБІНСКІМ РАЁНЕ на сёнешні дзень завербавана б. гарнякоў усяго 7 чалавек. Гэтага становішча нельга цярпець у той час, як у раёне ёсьць ня менш 100 чал., працаваўшых раней у капальнях.

Вярбоўшчыку невыстарчальна аказваецца дапамога. Ня ўсе камсамольскія ячэйкі ўзяліся за гэту справу.

У раёне да месц не даведзены тыя пастановы партыі і ўраду, у якіх гаворыцца аб ільготах закантрактаваўшым сябе на работах у каменнавугальнай прамысловасьці. Аб гэтых ільготах ня ведаюць былыя гарнякі. Хлусьня кулака і яго агентаў аб тым, што нібы гарнякі працуюць у асабліва цяжкіх умовах, не заўсёды сустракае належнага адпору.

Гарняк.

Чакаюць „асобных" пастаноў

Калі вярбоўшчыкі Данбасу прыехалі ў Ляднянскі раён для кантрактацыі рабочай сілы ў капальні, яны зьвярнуліся за дапамогаю ў райкалгассаюз. Апошні рашучым чынам заявіў:

— Ніякіх рабочых вам не дамо. За невыкананьне плянаў сіўбы будуць крыць на вас, а нас. Дапамогі не чакайце.

Атрымаўшы такі адказ, вярбоўшчыкі пайшлі ў райвыканком. Старшыня райвыканкому прыняў данбасаўскіх рабочых вельмі далікатна, але ўсё-ж такі паўтарыў словы райкалгассаюзу:

— Ніякай рабсілы, ніякай дапамогі аказаць мы ня ў стане...

— Вы-ж пастанову Сакратарыяту ЦК КП(б)Б павінны выконваць? — прабавалі запытацца вярбоўшчыкі.

— Ніякай пастановы з цэнтру мы не атрымлівалі, тым больш такую, якая-б гаварыла аб вашых справах, — аўтарытэтна заявіў старшыня райвыканкому.

Вярбоўшчыкі прабавалі пагаварыць у райкомах КП(б)Б і ЛКСМБ, але підзе дапамогі не атрымалі. Усе заяўляюць—нима ў нас былых гарнякоў. Між тым, паводле нявоўных

ПАТРОІЦЬ ТЭМПЫ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ!

ТОЛЬКІ 16,7 проц. ПАСЕЎНАГА ПЛЯНУ ВЫКАНАЛА БССР на 20 МАЯ

Максымальная арганізаванасьць!—Усе сілы і сродкі—на адстаючыя вучасткі,—Самы бязьлітасны ўдар па кулакох і па іх дапаможніках—апартуністах, якія імкнуцца сарваць ушчыльненьне тэрмінаў сяўбы, тармозяць укараненьне зьдзельшчыны і разгортваньне ўдарніцтва на палёх

Пераможцы бальшавіцкай вясны

12 калгасаў Случчыны

бліскуча скончылі сяўбу

СЛУЦАК, 23. (Па тэлефону ад наш. спэц. кар.).

Сяўбу скончылі больш 12 калгасаў. Калгасы «БУДАЎНІК», «КАМІНТЭРН», «КАМБАЙН», «БАЛЬШАВІК», «КРАІНА САВЕТАЎ», «ЧЫРВОНАЯ ВАСЕЯ», бліскуча справіўшыся з задачай, максымальна скарацілі тэрміны сяўбы.

ТЭРМІН ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ СЯЎБЫ Ў ГЭТЫХ КАЛГАСАХ СКАРОЧАН АД 10 ДА 17 ДЗЁН. Ударная работа была дасягнута дзякуючы правільнай арганізацыі працы, пераводу кожнага калгасьніка на зьдзельшчыну з дакладным улікам работы і штодзеннай інфармацыі калгасьнікаў аб колькасьці залічаных працадзён.

Калгасы, скончыўшыя сяўбу поўнасьцю, ВЫКАНАЛІ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ. Некаторыя з іх ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛЯНАВЫЯ ЗАДАНЬНІ ПА ТЭХНІЧНЫХ І ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУРАХ. У перадавых калгасах па сяўбе РАЗГАРНУЛАСЯ ЭНЭРГІЧНАЯ РАБОТА ПА ДАПАМОЗЕ АДСТАЮЧЫМ КАЛГАСАМ. З калгасы вылучылі буксірныя брыгады.

На 23 плян сяўбы яравых па раёне выканан на 40 з лішкам працэнтаў, засеяна больш 6 тысяч гэктараў.

НЕДАПУШЧАЛЬНА ПАВОЛЬНА ПРАХОДЗІЦЬ СЯЎБА Ў САЎГАСАХ. САЎГАСЫ ІВАНЬ, НЕКРАШЫ, РОЛЬЧЫЦЫ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ ВЫКАНАЛІ АД 19 ДА 25 ПРОЦ. Саўгасы і МТС ставяць раён пад пагрозу ня скончыць ў тэрмін сяўбу.

123 проц. пляну сяўбы тэхкультур

выканалі калгасы імя VI зьезду саветаў і „Чырвоная ніва"

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлеграфу).

19-га мая першымі скончылі сяўбу ў раёне калгасы імя VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ І «ЧЫРВОНАЯ НІВА».

Плян сяўбы калгасамі выканы на 100 проц., прычым ПЛЯН ПАСЕВЕ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР ВЫКАНАН НА 125 ПРОЦ.

РАЙКОМ КП(б)Б.

У глыбокім тыле

20.000 ПУД. БУЛЬБЫ ГНІЕ

ў саўгасе „Завалочыцы"

ГЛУСК, 22.

У саўгасе ЗАВАЛОЧЫЦЫ ў капцох псуецца каля 20 тыс. пудоў насеннай бульбы.

Па нарадзе Саўгастрэсту за атрыманьнем гэтай бульбы прыехалі прадстаўнікі ВІЦЕБСКАГА і ПОЛАЦКАГА РАЁНАЎ. Умовіліся аб цане, аб перавозках, заказалі на станцыі Старыя Дарогі вагоны. Нечакана Саўгастраст тэлеграфна загадаў—«нарады адмяняюцца і ўся бульба перадаецца Глускаму райзе».

Прайшло ўжо два тыдні, а Глускі райзе не забірае бульбы. У калгасах ГЛУШЧЫНЫ вялікі недахват насеннай бульбы, а ў саўгасе бульба дарэсла, гніе. Райкалгассаюз і райземаддзел ніяк нарадаў на бульбу калгасам не выдаюць.

Глуская райКК-РСІ павінна неадкладна прымусіць кіраўніцоў райкалгассаюзу і райземаддзелу разьмеркаваць насенную бульбу па калгасах раёну.

С.

Калгас „Пралетары" і саўгасы—раўняйцеся па лепшых!

ГАБРУЙСК. (Наш кар.). Калгасы Габруйшчыны на 20 мая засеялі 23 проц. пляну.

Асабліва дрэнна праходзіць сяўба тэхнічных культур: на ільне засеяна толькі 2 проц. вызначанай плошчы, па каноплях—1 проц., па сіласных культурах — 1 проц і па гародных—8,2 проц.

Калгасы «Бальшавік», «Мяркуры», «Завет Ільліча», «Чырвоная ніва», імя Карла Маркса, «Найе Лебэн» у асноўным скончылі сяўбу.

Слаба праводзіцца сяўба ў калгасе «Пралетары». Адсутнічае працоўная дысцыпліна. Трактар пачынае працаваць толькі ў 11 гадз. раніцы і ўсяго працуе 4 гадзіны. Зразумела, што норма трактарам не выпрацоўваецца. Зьдзельшчына ў калгасе праводзіцца толькі на паперы.

Саўгасы таксама яшчэ не разгарнулі сяўбы. Саўгас Дурынічы на 20 мая выканаў плян толькі на 12,5 проц., саўгас Жылічы—на 19,4 проц. Адназасобнікамі плян сяўбы выканан на 24,3 проц.

МАГІДАЎ.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДВУХДЭКАДНІКА «СЬВІНАГАДОЎЛІ ПА САЎГАСАЎ СЬВІНАВОДА»

1. Правесьці двухдэкадзік сьвінагадоўлі па саўгасах Сьвінавода з 23 мая. Паставіць асноўнымі задачамі двухдэкадніка:

а) Поўнае выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў, стварэньне ўласнай кармавой базы.

б) Фарсаваньне ўкамплектаваньня, правядзеньне злучной кампаніі і захаваньне маладняка.

в) Рашучае фарсаваньне адкорму і здачы таварнай прадукцыі.

г) Абавязковае ўвядзеньне зьдзельнай і зьдзельна-прэміяльнай сыстэмы аплаты працы, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і ахуладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі шырокімі рабочымі масамі.

д) Забесьпячэньне належнымі памяшканьнямі і фарсаваньне пачатага будаўніцтва.

2. Абавязаць Райкомы, ячэйкі КП(б)Б і дырэктароў саўгасаў разгарнуць масавую кампанію школ асноўных задач двухдэкадніка і забясьпечыць іх поўнае і своячасовае выкананьне.

3. Прапанаваць ЦК ЛКСМБ прыняць рашучыя меры да таго, каб забясьпечыць найбольш актыўны ўдзел у правядзеньні двухдэкадніка ўсёй камсамольскай арганізацыі і ў першую чаргу камсамольцаў сьвінагадоўчых саўгасаў.

4. Райкомы КП(б)Б павінны паставіць у якасьці асобна важнай задачы прыцягненьне да правядзеньня двухдэкадніка сялянак-жанчын, асабліва работніц саўгасаў.

5. Рэдакцыям газэт «Зьвязда», «Сав. Беларусь» і «Калгасьнік Беларусі» на працягу двухдэкадніка адвесьці ня менш дзьвёх старонак, прысьвечаных правядзеньню двухдэкадніка.

Аб парадку чысткі калгасаў ад кулакоў

Усім калгассаюзам і праўленьням калгасаў

Устаноўлена, што ў радзе месц скажаецца дырэктыва Калгасцэнтру аб парадку чысткі калгасаў ад кулацкіх элементаў. Замест выяўленьня кулацкіх элементаў і выгнаньня іх з калгасаў, у асобных раёнах (Чашніцкі і інш.) арганізавана чыстка калгасаў па прыкладзе савецкага апарату з абавязковым выклікам усіх калгасьнікаў. Ёсьць выпадкі, калі пры няправільнай арганізацыі чысткі, пры дрэнна праведзенай папярэдняй масавай рабоце сярод беднаты, актыву калгасьнікаў і г. д. у асобных выпадках вычышчаюць з калгасаў середнякоў і беднякоў. Такія скажэньні, палітычныя памылкі з боку асобных саюзаў дапамагаюць кулацтву і шкодзяць калгаснаму руху.

Выходзячы з гэтага катэгарычна забараняем арганізоўваць чыстку калгасаў па прыкладзе чысткі савецкага апарату.

Калгасаюзы абавязаны, шляхам выезду ў калгасы, засьмечаныя кулацкімі элямэнтамі, выявіць кулацкія паспадаркі праз мясцовыя арганізацыі, сходы беднаты, гутаркі з актывістамі і толькі пасьля праверанных фактаў, якія сьцьвярджаюць, што тая ці іншая гаспадарка зьяўляецца кулацкай, ставіць гэта пытаньне на абгаварэньне праўленьня калгасу, выносячы пастанову праўленьня аб выключэньні кулацкай гаспадаркі з калгасу на зацьвярджэньне агульнага сходу калгасьнікаў.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

АБ МАБІЛІЗАЦЫІ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ З СТАРЫХ КАЛГАСАЎ ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ НОВЫХ КАЛГАСАЎ

1. Ўдзічаючы вялікую колькасьць поваарганізаваных калгасаў за зімовы і веснавы час, якія ня маюць яшчэ падрыхтаваных кіруючых кадраў, лічыць неабходным апрача ўжо перакінутых з старых у новыя калгасы 700 чалавек мабілізаваць на працягу чэрвеня дадаткова 1.000 лепшых перадавых калгасьнікаў з раней арганізаваных калгасаў для накіраваньня для кіруючай работы ў новыя калгасы ня менш як на 6 месяцаў.

2. Прапанаваць РК КП(б)Б зараз-жа прыступіць да правядзеньня масавай работы сярод калгасьнікаў аб неабходнасьці аказаньня дапамогі ў замацаваньні новых калгасаў.

ЦК указвае на неабходнасьць правядзіць работу па мабілізацыі выключна на аснове добраахвотнасьці.

3. Агітмасаваму аддзелу ЦК і Калгасцэнтру ў 3-хдзённы тэрмін вызначыць канкрэтныя заданьні для раёнаў і даць практычныя паказаньні аб парадку перакідкі старых калгасьнікаў у новыя калгасы.

ЗВОДКА ПАСЕЎБЮРО НКЗ БССР

аб становішчы калектывізацыі і ходзе сяўбы па БССР на 20 мая, паводле вестак з 79 раёнаў (па іншых раёнах весткі даюцца па становішчы на 15 мая)

РАЁН			Проц. калект.	Агульны плян зас. яравых у га	Засеяна яравых у проц. да пляну усяго	Калгасамі	Адназасобнікамі	Саўгасамі	Засеяна яравых па асноўных культурах у проц. да іх плянаў: Збожжавых	Лён, канопля	Бульба	Корм. коранепл.	Гародніна	Сіласных	Трэўзапасаў	Канюш. пікафеўка
Азарыцкі	—	—	21,3	14249	42,9	29,6	48,8	—	55,2	48,6	36,2	2,7	1,1	—	1,4	41,6
Аршанскі	—	—	39,7	29865	15,1	22,6	12,8	7,4	22,1	8,6	18,3	—	13,1	—	8,6	5,8
Асіпавіцкі	—	—	39,7	29865	34,3	59,9	27,5	—	40,2	17,0	35,9	3,2	22,4	—	—	2,7
Асьвейскі	—	—	30,6	15394	25,4	22,4	37,4	—	22,7	4,4	10,9	10,9	36,2	—	0,7	11,2
Бабруйскі	—	—	13,8	51622	12,[illegible]	6,9	14,6	6,7	21,7	0,8	15,2	1,7	1,2	—	—	4,2
Вагушэўскі	—	—	31,8	22827	Весткі не прадстаўляў з пачатку кампаніі											
Барысаўскі	—	—	19,8	36435	22,4	14,5	26,0	25,3	20,0	2,3	27,0	1,3	6,8	—	5,0	88,9
Бешанковіцкі	—	—	24,3	29661	3,7	8,5	2,1	—	9,0	—	1,6	—	—	—	1,0	1,8
Боркавіцкі	—	—	44,2	22295	4,4	5,2	4,1	—	13,0	—	2,7	3,7	4,3	—	0,8	11,3
Брагінскі	—	—	33,0	28340	25,5	18,9	30,9	50,9	40,6	20,1	18,4	—	11,3	—	39,2	7,1
Быхаўскі	—	—	18,8	36022	36,7	19,2	41,2	49,7	28,2	21,5	55,4	3,9	18,0	—	2,2	11,4
В.-Кашалеўскі	—	—	25,0	23548	28,4	14,6	35,9	44,7	39,2	27,2	19,2	—	62,3	—	—	16,1
Вягомльскі	—	—	44,9	21804	8,3	14,4	5,6	3,5	12,1	—	11,1	—	—	—	0,4	—
Вялыніцкі	—	—	29,0	32147	8,9	8,6	8,9	—	14,4	0,6	10,5	—	—	—	1,3	2,9
Вярэйскі	—	—	22,5	27232	15,9	20,7	13,8	17,2	16,6	14,8	14,7	2,3	2,7	—	0,1	6,5
Веткаўскі	—	—	22,1	36321	17,2	15,8	19,1	0,3	21,5	19,5	18,7	0,1	2,1	—	2,0	28,7
Ветрынскі	—	—	25,7	21321	8,0	3,6	2,9	—	5,4	—	2,9	—	0,4	—	—	10,2
Віцебскі	—	—	38,0	30459	9,7	13,4	9,0	—	21,6	1,6	6,3	3,8	1,4	2,2	4,4	9,4
Вульскі	—	—	37,0	21225	18,4	35,7	15,2	—	31,7	0,5	6,5	—	—	—	20,7	—
Вушацкі	—	—	35,5	23621	6,7	18,8	2,5	—	10,5	5,5	1,7	0,7	0,4	—	—	—
Высачанскі	—	—	38,6	20778	4,8	10,7	1,7	15,7	7,7	—	5,5	—	0,8	—	7,9	8,7
Гарадоцкі	—	—	11,7	48386	6,6	39,0	—	—	11,1	—	2,0	—	8,7	—	—	—
Горацкі	—	—	42,6	33335	19,5	28,4	16,0	15,6	20,2	1,7	17,3	9,4	25,5	—	—	2,3
Гомельскі	—	—	17,2	25633	26,4	15,2	31,6	23,6	37,0	3,1	21,0	16,8	25,1	7,7	9,4	30,9
Глускі	—	—	21,8	34182	38,2	33,0	45,2	0,2	40,6	28,3	32,0	3,4	18,9	—	52,7	55,1
Грэскі	—	—	29,6	22576	23,4	27,5	21,3	29,7	32,1	10,2	23,4	4,2	11,2	0,9	8,7	15,8
Дрыбінскі	—	—	25,4	25075	13,1	45,7	3,8	7,4	3,6	—	8,6	0,6	2,6	—	6,8	6,4
Дрысенскі	—	—	32,4	18793	1,1	1,9	0,5	—	1,0	—	—	—	0,2	—	—	2,1
Дубровенскі	—	—	31,7	26150	12,1	16,2	10,7	15,5	14,6	5,1	22,3	3,4	22,7	—	8,6	14,1
Жлобінскі	—	—	16,5	40764	36,0	28,8	43,1	23,2	50,2	27,3	42,3	2,0	13,1	0,9	2,4	13,6
Журавіцкі	—	—	26,0	21283	20,5	19,6	22,5	—	25,2	22,3	18,7	2,6	9,1	—	4,1	71,8
Жыткавіцкі	—	—	39,3	9396	12,3	18,8	8,9	—	11,0	7,3	16,2	—	5,7	—	—	0,4
Заслаўскі	—	—	39,5	27443	8,3	8,2	8,3	9,2	11,4	—	11,3	1,0	1,2	—	1,1	1,9
Камарынскі	—	—	39,4	13759	13,4	13,0	11,8	—	27,2	0,8	8,1	—	—	—	2,7	54,2
Капаткевіцкі	—	—	18,7	13355	20,0	20,1	21,9	—	23,0	19,5	25,3	0,3	—	—	—	26,3
Каралінскі	—	—	32,3	18028	10,5	14,4	8,1	16,3	14,3	5,3	8,6	1,4	3,8	—	5,6	—
Кармянскі	—	—	28,9	26898	7,0	9,0	6,0	—	14,8	—	4,2	—	0,9	—	—	3,5
Касьцюковіцкі	—	—	59,1	38945	12,9	27,8	6,0	—	20,1	1,0	9,6	—	0,3	0,8	0,1	34,4
Клімавіцкі	—	—	62,0	46887	8,9	11,1	6,1	29,3	13,5	—	5,1	0,2	0,8	—	0,3	1,9
Клічаўскі	—	—	24,9	18753	13,5	27,0	9,2	7,6	0,9	—	0,4	—	—	—	—	—
Капыльскі	—	—	25,3	36073	28,8	23,4	30,0	48,6	36,2	4,2	27,4	4,2	1,5	—	20,2	26,7
Копыскі	—	—	46,1	20568	19,4	24,5	16,8	—	25,4	21,5	25,9	—	—	—	8,5	—
Коханаўскі	—	—	37,4	26368	15,0	9,6	18,0	21,8	0,7	0,1	0,7	—	0,6	—	0,5	—
Койданаўскі	—	—	50,0	45046	24,7	33,3	19,4	17,5	42,0	5,8	19,8	8,8	2,2	7,2	5,9	1,7
Круглянскі	—	—	44,5	25105	1,3	1,7	0,5	22,5	1,8	—	1,4	5,3	3,8	—	—	—
Крупскі	—	—	20,0	17213	8,1	5,4	9,3	7,5	7,2	—	19,5	—	—	—	—	—
Крычаўскі	—	—	48,3	22672	17,0	31,4	11,1	12,2	7,4	0,3	11,3	—	2,6	—	0,5	—
Лагойскі	—	—	30,3	28997	11,9	9,9	13,1	15,1	13,0	6,6	11,5	0,9	4,5	0,7	1,4	5,0
Лёзьненскі	—	—	26,0	24797	2,7	2,9	2,6	—	0,7	—	—	0,1	0,2	—	—	3,8
Лельчыцкі	—	—	19,7	15533	29,8	46,4	25,4	—	33,2	31,2	23,3	3,4	—	—	—	—
Лепельскі	—	—	71,4	24120	12,1	26,1	3,6	—	12,1	5,1	8,1	1,2	—	—	—	34,0
Лоеўскі	—	—	27,6	21916	15,0	15,5	14,3	—	10,1	7,0	14,4	0,2	116,4	2,4	6,3	2,4
Ляднянскі	—	—	44,9	11734	14,8	18,1	12,0	34,4	19,7	0,9	—	0,7	—	1,5	7,1	10,1
Любаньскі	—	—	30,6	25607	31,1	39,6	34,3	8,8	38,1	8,6	35,8	3,1	2,3	—	7,8	46,9
Магілеўскі	—	—	25,9	61561	9,2	12,7	8,3	—	14,3	8,5	11,4	0,4	0,8	5,6	1,5	—
Мазырскі	—	—	25,2	25893	30,0	32,1	31,6	—	40,0	40,2	20,9	8,4	40,5	1,8	0,9	16,7
Межанскі	—	—	26,3	16850	4,8	6,3	4,4	—	9,7	0,8	4,5	—	—	—	14,5	13,8
Менскі	—	—	59,9	47903	13,1	17,0	7,0	9,8	14,6	0,5	12,1	4,7	7,2	2,5	1,9	3,6
Мсьціслаўскі	—	—	56,4	31855	12,7	25,9	6,6	22,0	14,3	—	1,5	1,7	3,1	—	40,2	2,3
Нараўлянскі	—	—	22,8	21001	16,4	30,7	11,6	—	18,2	13,8	17,0	8,4	3,7	—	12,0	52,8
Парыцкі	—	—	15,0	27145	44,0	19,8	54,8	22,5	53,6	58,4	39,0	0,3	39,1	—	—	16,9
Плешчаніцкі	—	—	42,3	22903	10,1	20,1	5,8	—	12,4	0,6	10,2	0,2	3,1	—	—	2,7
Полацкі	—	—	42,0	28197	5,1	9,8	2,5	16,3	6,5	0,2	5,4	1,7	2,2	0,3	2,2	6,7
Прапойскі	—	—	42,5	23746	32,7	73,3	19,9	—	46,5	16,9	17,2	—	2,9	—	—	8,0
Пухавіцкі	—	—	20,5	41221	11,3	8,6	13,1	13,0	12,2	3,8	3,4	0,3	0,2	—	1,8	2,9
Петрыкаўскі	—	—	27,1	20820	18,8	25,4	17,4	11,7	16,7	17,7	23,3	3,5	3,9	—	—	7,4
Рагачоўскі	—	—	21,2	43483	31,7	15,1	42,7	49,6	35,9	24,3	36,1	4,1	7,2	2,9	8,7	6,7
Расьнянскі	—	—	37,9	17598	6,6	10,6	4,7	—	10,9	—	3,6	0,3	—	0,6	—	—
Расонскі	—	—	23,0	25151	9,6	10,0	9,4	—	20,5	1,4	3,1	0,1	—	—	—	14,8
Рэчыцкі	—	—	13,7	39801	28,1	17,0	33,0	30,3	33,7	29,5	31,3	3,9	10,4	2,1	1,5	23,5
Сеньненскі	—	—	39,9	30188	8,9	—	—	—	12,6	2,7	8,4	—	—	—	25,6	—
Сіроцінскі	—	—	37,6	29983	6,7	9,5	5,6	13,2	11,7	0,4	9,1	—	—	—	7,7	6,9
Слуцкі	—	—	33,5	41699	30,9	34,8	29,7	21,4	47,7	16,7	32,1	7,3	16,1	0,5	7,4	22,9
Смалявіцкі	—	—	28,5	30456	15,9	24,9	8,9	—	23,2	9,0	12,5	5,5	0,4	5,2	—	8,5
Старобінскі	—	—	27,5	25389	18,2	22,0	17,3	8,8	21,4	16,8	22,2	2,5	0,5	—	4,8	20,1
Стара-Дарожскі	—	—	22,0	29934	41,9	30,3	46,3	22,4	41,5	21,5	48,9	1,3	27,7	—	46,6	9,9
Сураскі	—	—	17,8	29571	1,9	1,4	2,1	—	5,7	—	0,3	—	—	—	—	0,9
Сьвіслацкі	—	—	26,8	16806	20,0	29,4	17,4	41,1	20,5	19,8	30,4	0,5	13,9	—	4,8	2,7
Сьмілавіцкі	—	—	17,1	29625	36,0	24,2	43,6	24,8	36,4	31,1	35,0	3,2	13,2	—	5,2	34,2
Талачынскі	—	—	49,5	25727	8,0	14,8	4,9	4,3	9,0	4,0	4,6	—	0,9	—	4,7	3,6
Тураўскі	—	—	29,3	11759	31,4	36,2	30,0	23,2	39,8	15,9	28,9	1,4	12,8	0,4	12,8	5,4
Уваравіцкі	—	—	19,0	36048	2,3	3,7	1,6	4,1	4,2	0,2	0,6	—	1,4	—	—	2,8
Вузьдзенскі	—	—	20,1	27821	15,3	12,6	15,5	27,5	9,5	2,6	3,3	0,2	4,3	—	1,0	0,9
Халопеніцкі	—	—	36,3	18225	14,0	28,2	7,6	29,7	21,3	0,8	9,5	0,3	3,0	—	10,8	8,6
Хоцімскі	—	—	68,1	19601	11,8	25,6	4,6	—	21,2	0,1	7,8	—	—	—	1,9	4,3
Хойніцкі	—	—	31,4	24400	51,6	33,9	74,6	42,1	67,6	57,9	38,6	11,2	63,1	9,9	49,4	—
Церахаўскі	—	—	20,6	44502	Вестак не прадстаўляў з пачатку кампаніі											
Чавускі	—	—	24,2	48596	13,8	15,8	13,4	0,9	19,1	2,0	17,9	2,8	2,8	—	1,9	10,8
Чарэйскі	—	—	29,3	20177	0,5	1,2	—	—	0,6	—	—	—	—	—	2,1	1,0
Чачэрскі	—	—	18,4	24023	9,9	11,9	—	—	14,4	7,8	8,6	0,2	6,4	—	—	19,7
Чачавіцкі	—	—	15,6	17691	25,1	18,8	24,8	59,9	28,8	11,3	30,9	—	—	—	—	8,7
Чашніцкі	—	—	44,4	13188	6,7	10,2	1,6	38,4	9,0	0,5	2,6	2,9	3,2	—	3,7	10,5
Чырвонапольскі	—	—	26,1	26209	15,3	22,3	13,1	19,8	25,5	8,1	6,7	—	—	—	7,1	73,4
Чэрвеньскі	—	—	20,6	34813	10,8	8,9	11,6	13,4	5,8	4,8	7,9	—	0,8	1,0	2,0	1,5
Чырвона-Слаб.	—	—	25,1	21754	17,9	20,9	17,3	—	23,0	7,1	21,7	7,3	—	—	16,6	2,9
Чэрыкаўскі	—	—	45,1	28209	14,5	19,5	13,6	2,2	20,2	7,7	9,5	1,0	2,2	—	—	23,2
Шклоўскі	—	—	29,8	40265	18,6	22,2	17,1	45,5	17,3	5,0	17,3	0,6	21,8	—	—	8,5
Юравіцкі	—	—	28,6	13942	26,9	21,2	30,8	—	34,7	56,9	17,4	2,0	1,9	1,2	0,7	29,7
Па БССР	—	—	30,3	2674226	16,7	18,0	16,0	14,2	21,2	6,4	16,9	2,0	6,8	1,0	5,8	8,5

Уключыліся ў конкурс

КРУПКІ. Райком КП(б)Б і рэдакцыя шматтыражкі «Камуністычны шлях» уключыліся ў конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы. Умовы конкурсу разасланы ў парт'ячэйкі, сельсаветы і калгасы. На раён накіроман актыў для мабілізацыі калгасьнікаў вакол конкурсу.

Складзен спэцыяльны штаб для кіраўніцтва конкурсам.

***

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Раён уключыўся ў конкурс, абвешчаны ЦК КП(б)Б. Нізавым арганізацыям даны канкрэтныя ўказаньні аб парадку правядзеньня конкурсу. Разгортваецца практычная ўдарная работа па давядзеньні ўмоў да кожнага калгасьніка.

***

ГОМЕЛЬ. Гомельскі прыгарадны саўгас уключыўся ў конкурс па правядзеньні сяўбы.

Гомельскі саўгас ЦРК выклікае на сацспаборніцтва прыгарадную гаспадарку Менскага ЦРК на лепшае выкананьне ўмоў конкурсу, які абвешчан ЦК КП(б)Б.

***

ШУМІЛІНА. (Па тэлеграфу). Сіроцінскі раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае правядзеньне масавай сяўбы.

Кіраўніцтва конкурсам ускладзена на спэцыяльна арганізаваны раённы штаб. Для растлумачэньня ўмоў конкурсу і для правядзеньня работы ў сельсаветы і калгасы накіравана 42 работнікі раённага актыву. Вызначана прэмія ў 1.000 руб. за лепшае правядзеньне сяўбы.

***

ЛЁЗНА. (Па тэлеграфу). Лёзьненскі раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы і ў пераклічку ільнаводных раёнаў БССР. Для кіраўніцтва работай па конкурсе створан райштаб. Вызначаны прэміі лепшым калгасам, ударным брыгадам і ўдарнікам.

***

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Калгасы раёну адзін за другім уключаюцца ў конкурс на ўдарнае правядзеньне другой калгаснай вясны.

Калгасьнікі арцелі **«Копас»**, Гарадзішчанскага сельсавету, абавязаліся скончыць сяўбу **да 1 чэрвеня. Калгас бярэ** на сябе абавязак павялічыць плян засеву тэхнічных і сіласных культур і травасельня, наладзіць улік зьдзельшчыны і праверку выкананьня калгасьнікамі заданьняў.

Да 1 чэрвеня кожны калгасьнік павінен завербаваць у калгас ня менш адной бядняцка-серадняцкай гаспадаркі.

У адказ на заклік менскіх ударнікаў друку, калгасьнікі абавязуюцца засеяць 1 га ільну ў фонд нізавога бальшавіцкага друку. Калгасьнікі выклікалі на сацспаборніцтва калгас «Адраджэньне», «1 мая» і імя XVI зьезду УсеКП(б).

У Меншчыне абвяшчаецца дэкада штурму прарываў веснавой сяўбы

Бюро менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б аб ходзе сяўбы

Бюро гаркому КП(б)Б прызнае ход сяўбы пагражаючым, бо цяперашнія тэмпы веснавой сяўбы не забясьпечваюць своячасовага скапчэньня не ў вызначаны тэрмін.

Выходзячы з гэтага, бюро гаркому пастанаўляе:

Абвясьціць да 1-га чэрвеня г. г. дэкаду штурму прарываў веснавой сяўбы.

Да 5 чэрвеня г. г. забараніць скліканьне пасяджэньняў гарсавету, ГСПС і ГК ЛКСМ з тым, каб усе сілы былі накіраваны ў сельсаветы, саўгасы і калгасы на ліквідацыю прарываў веснавой сяўбы.

Прапанаваць усім сельпарткомам, ячэйкам КП(б)Б, кіраўніком саўгасаў, Калгассаюзу, сельсаветам і гарсавету рашуча ўзмацніць кіраўніцтва ходам сяўбы, узяўшы пад неаслабны агляд кожны саўгас, калгас, устанавіўшы для кожнага саўгасу і калгасу каляндарны тэрмін сяўбы, давёўшы штодзённае заданьне да кожнага рабочага саўгасу і калгасьніка.

Узяць пад асобны нагляд і аказаць адпаведную дапамогу ў сяўбе, у першую чаргу з боку МТС, адстаючым калгасам «Кастрычніцкая рэвалюцыя», імя Фалько, імя Варашылава, «Бальшавік», «Чырвоная ніва», «Ленінскі шлях», імя Будзённага, «Вызваленьне», «Прамень сацыялізму», «Чырвоны спэцыяліст» і імя Сталіна, а таксама саўгасам: «1 мая», «Вішнёўка» і «Сеньніца».

Ва ўсе адстаючыя саўгасы і калгасы накіраваць штурмавыя тройкі з адказных работнікаў для дапамогі на ліквідацыі прарыву. Забараніць камандыраваным у вёскі таварышом варочацца назад да сканчэньня сяўбы.

Штурмавым тройкам выехаць не пазьней 24 мая. Арганізацыю і пасылку троек даручыць т. т. Карначову і Шулькіну.

Абавязаць т. т. Карначова і Шулькіна мабілізаваць на дапамогу ў правядзеньні сяўбы шэфарганізацы

Па Савецкай Беларусі

Райгрупком адарваны ад мас

Боркавіцкі райгрупком саюзу саўгандальслужачых на працягу 9 месяцаў не праводзіў вінаватага сходу членаў саюзу. Райгрупком не займаўся пытаньнямі гаспадарча-палітычнага характару. Уся работа яго выяўлялася ў разьмеркаваньні талёнаў на прамтавары. Пытаньняў калектывізацыі і веснавой сяўбы групком на сваіх насяджэньцаў не праводзіў ніводнага сходу членаў, рэагаваў на выпадкі антысэмітызму і шавінізму, якія мелі месца сярод членаў саюзу. Райпрафсавет ня кіраваў работай райгрупкому і на сыгналы членаў саюзу аб бязьдзейнасьці райгрупкому ніякіх мер ня прымаў. Райканфэрэнцыя саюзу, якая адбылася гэтымі днямі, вынесла вымовы ўсяму складу райгрупкому і рэвізійнай камісіі. Новы склад раймясцкому павінен будзе ўдарнымі тэмпамі правесьці перабудову сваёй работы, каб да VII Усебеларускага зьезду прафсаюзаў рапартаваць аб першых выніках і посьпехах перабудовы.

Баумель

Аршанскаму раёну чыг. спэцыялісты не патрэбны

Ва ўмовах недахвату кваліфікаваных кадраў, пытаньне рацыянальнага скарыстаньня тэхнічных работнікаў мае вялікае значэньне. Між тым галаваны з аддзелу кадраў Аршанскага раёну № 3 МББ чыг. гэтаму пытаньню не аддаюць ніякай увагі.

Зьвернуты на транспарт, згодна пастановы Наркамправы, электратэхнік **Вэндыктэй А.**, які мае вялікі стаж практычнай работы і выконваў рад адказных работ, працуючы прарабам на цэнтральнай электрастанцыі імя Леніна ў Барысаве, пазначан радавым электрамаўлёнцам Барысаўскага дэпо, дзе фактычна няма чаго рабіць.

Ня кажучы ўжо аб тым, што зарплата тав. Вэндыктава зьменшылася ў тры з паловай разы, само такое скарыстаньне работніка заслугоўвае рэзкага асуджэньня. Тым больш, што яшчэ ў 1928 г. тав. Вэндыктэй працаваў электрамэханікам на 4 вучастку аддзелу сувязі МББ чыг. па абсталяваньні тэлефона-тэлеграфнай сеткі.

Наркамправы павінен зьвярнуць увагу на такое скарыстаньне спэцыялістаў.

В.

Ня выконваюцца заказы

па мэханізацыі пагрузак

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). Мэханізацыя пагрузачна - разгрузачных работ і перавалачных пунктаў па Днепрадзьвінскім басэйне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Хэрсонскі завод замест таго, каб выканаць заказ па абсталяваньні пагрузачна - разгрузачных работ і перавалачных пунктаў, корміць толькі абцаньнямі. Апошнія абяцаньні ён даў на ліпень месяц

Апрача гэтага Паўночна - Заходняе Дзяржпараходзтва раней згадзілася адпусьціць два брэнсбэргі, а зараз адмаўляецца выканаць сваё абяцаньне.

Каб канчаткова не сарваць пляну мэханізацыі, Днепрадзьвінскае кіраўніцтва вядзе работу па пабудове перавалу з прымітыўнай мэханізацыяй ў Чэпіне да 120 мэтраў вышынёю на крутым ўзьдыме. У галоўным адказьнейшым перакалачным пункце ў Чэпіне да гэтага часу мелі месца вялікія тормазы па абсталяваньні і мэханізацыі, але дзякуючы ўмяшаньню НК РСІ справа рушылася значна наперад. Перавалачны пункт мяркуецца адкрыць у маі месяцы.

А.

Справа аб замаху на забойства калгасьнікаў

Выязная сэсія народнага суда 3 вучастку гор. Менску ў Каралішчанскім сельсавеце, Менскага прыгараднага раёну, разглядала 5-га мая справу кулакоў **Касьцялецкіх** Кастуся, Язэпа і Казімира, якія зрабілі замах на забойства калгасьнікаў Шайко і Касьцялецкага. Выязная сэсія прыгаварыла іх да пазбаўленьня волі і ссылкі ў працоўныя лягеры ў воддальныя мясцовасьці СССР тэрмінам на 10 год кожнага з канфіскацыяй маемасьці.

На чырвоную дошку

12 мая скончылася за тры дні раней тэрміну ўстаноўка новай машыны на Жыткавіцкім камбінаце. Вялікія труднасьці па ўстаноўцы машыны (недахват інструмантаў, абсталяваньня, адсутнасьць цокальнай падстаўкі і г. д.) былі перамоганы, дзякуючы адданай працы рабочага калектыву сьлясарна-мэханічнага цэху, дзякуючы вынаходніцтву і ўдарнай працы кіраўніка ўстаноўкі тав. **Махнача** і яго памочніка тав. **Кананучэнка.** Трэба прэміяваць лепшых рабочых-ударнікаў сацыялістычнай буДоўлі.

А. Галавач.

Ня маюць трансфінпляну

МАЗЫР. (Наш кар.). На прыстані ракі прыпяць рэйс пачаўся сваячасова, г. зн. зараз пасьля лёдаходу. Па гэтай лініі курсуюць пасажырскія і буксірныя параходы, а таксама працуюць 5 барж. Пасажырскія параходы заўсёды бываюць загружаны ня поўнасьцю, прыблізна на 50-70 проц. Што датычыць буксірных параходаў і барж, дык яны працуюць і загружаны амаль што на ўсе 100 проц. Уся бяда ў тым, што да гэтага часу **прыстань ня мае трансфінпляну.** Кіраўнікі прыстані сядзяць на беразе і чакаюць пакуль ім прышлюць прамфінплян з Дзяржпараходзтва.

За ўвесь час рэйсу—з 24 красавіка да 15 мая — было перавезена 1.476 тон грузаў, акрамя пасажырскіх.

Трэба зазначыць, што Дзяржпараходзтва сваячасова заключыла дагавары з гаспадарчымі адзінкамі на прадмет перавозкі і выгрузкі грузаў, па нашым рэйсе, але ў большасьці гэтыя дагаворы агідна парушаюцца з боку раду гаспадарчых арганізацый.

Напрыклад, сплаўная кантора Лесбелу замест 2-х дзён пагружае баржы па 10-12 дзён, або Камтрэст замест 2-х дзён пагрузкі, грузіць па 4-5 дзён, да таго-ж баржы поўнасьцю не загружаюць, што бязумоўна шкодна адбіваецца на плянавых перавозках і зьяўляецца недапушчальным зьявішчам, патрэбным выкананьня дагавору і фінпляну.

Да гэтага часу наглядаюцца **сыстэматычныя** спазьненьні прыбыцьця пасажырскіх параходаў на гадзіну, або дзьве.

Забесьпячэньне воднікаў вельмі дрэннае. Мясцовы ЦРК не зварачае на гэта ніякай увагі. Жыльлёвымі памяшканьнямі воднікі забясьпечаны, за выключэньнем грузчыкаў, якія ня маюць жыльлёвага памяшканьня і начуюць на прыстані. Культурна-выхаваўчая работа сярод воднікаў і грузчыкаў разгорнута невыстарчальна. Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена ня больш як 40-50 проц. рабочых.

Усе гэтыя ненармальныя зьявішчы павінны быць тэрмінова ліквідаваны. Неабходна зараз-жа скласьці трансфінплян, бо без яго немагчыма кіраваць гаспадаркай.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны накіраваць сваю штодзённую работу на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на выкананьне прамфінпляну. Гаспадарнікаў, якія парушаюць дагаворы, затрымліваюць параходы і баржы лішнімі непатрэбнымі днямі на пагрузцы, трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

ЗАЛЕСІН.

Крычаўскі райспажсаюз ня лічыцца з пастановай СПА

Пастановай СПА будаўніцтва ільназаводу аднесена да ўдарнага. Яно павінна забясьпечваць матар'яламі, рабочай сілай і інш. у першую чаргу.

Старшыня крычаўскага райспажсаюзу тав. **Іваноў,** аднак, зусім ня лічыцца з гэтай пастановай. Замест практычнай дапамогі будаўніцтву ільназаводу, тав. Іваноў адносіцца да гэтай справы бюракратычна. Нядаўна клімавіцкае аддзяленьне Саюзхлеба хадайнічала перад райспажсаюзам аб водпуску аўса для аднаго каня з будаўніцтва ільназаводу. Ня гледзячы на нязначнасьць гэтага патрабаваньня, тав. Іваноў знайшоў магчымым адмовіць Саюзхлебу.

Е.

ГАРСАВЕТ—ТВАРАМ ДА ПРАМФІНПЛЯНУ—

гэты баявы лёзунг невыстарчальна ажыцьцяўляюць гарсаветы БССР

Саветы слаба кіруюць работай дэпутацкіх груп на прадпрыемствах. Цясьней зьвязацца з заводамі. Наладзіць жывую работу дэпутацкіх груп—адна з важнейшых задач гарадзкіх саветаў

Дзе не разумеюць задач груп

Памылкі барысаўскага гарсавету

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Брыгада газэт **«Савецкая Беларусь»** і **«Бальшэвік Барысаўшчыны»** праверыла работу дэпутацкіх груп на прадпрыемствах. Дэпутацкія групы арганізаваны толькі на 3-х прадпрыемствах — «Чырвоная Бярэзіна», гуце імя Домбаля і заводзе «Камінтэрн». На першых двух прадпрыемствах групы арганізаваны два месяцы назад, але дагэтуль ня маюць плянаў работы. Парткалектывы і фабкомы ня цікавяцца работай груп.

У працэсе стварэньня дэпутацкіх груп дапушчан рад памылак, якія супярэчаць дырэктывам партыі і ўраду аб савецкай рабоце на прадпрыемствах. Гарсавет лічыць, што дэпутацкія групы павінны быць арганізаваны толькі на буйных прадпрыемствах. Намесьнік старшыні гарсавету тав. **Катко** заявіў: «Мы лічым непатрэбным стварэць дэпутацкія групы на тых прадпрыемствах, дзе ёсьць толькі 3-4 дэлегаты». Тав. Катко ня ведае дырэктыў аб тым, што ва ўмовах БССР дэпутацкія групы павінны быць арганізаваны на тых прадпрыемствах, дзе ёсьць 3 і больш дэпутатаў гарсавету.

Пры арганізацыі дэпутацкіх груп дапушчана яшчэ адна значная памылка. Паводле дырэктыў гарсавету, дэпутацкія групы на прадпрыемствах стварацца выключна з дэпутатаў і кандыдатаў у члены гарсавету, без прыцягненьня да пастаяннай работы ў групе рабочых-актывістаў. Гарсавет лічыць зусім нармальным такое зьявішча, калі на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна дэпутацкая група складаецца выключна з 50 дэпутатаў гарсавету.

Трэба зразумець, што толькі пры ўдзеле шырокага рабочага актыву можна ўзьняць на належную вышыню савецкую работу на прадпрыемствах і ажыцьцявіць сапраўдны паварот гарсавету тварам да вытворчасьці.

Дэпутацкая група—за ботай

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). Дэпутацкая група на **швэйнай фабрыцы імя Валадарскага** прыступіла ўжо да плянавай практычнай работы. На першым пасяджэньні бюро быў заслуханы даклад заведчыка закрытага разьмеркавальніка і судаклады брытады з членаў гарсавету і рабочых, якія абсьледавалі разьмеркавальнік. Даны канкрэтныя прапановы ў мэтах паляпшэньня работы.

Пленум групы пастанавіў устанавіць пастаянныя дзяжурствы на фабрыцы, каб рабочыя маглі атрымаць даведкі аб дзейнасьці гарадзкога савету. Бюро паставіла перад сабой задачу — **ніводнага рабочага па-за дэпутацкай групай.**

Члены групы павінны сваёй работай на вытворчасьці паказаць прыклад выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну па ўсіх паказальніках.

Гарадоцкі гарсавет зусім бязьдзейнічае

Бяз пляну, бяз сувязі з масамі

ГАРАДОК. (Наш кар.). Дырэктывы партыі аб ажыўленьні работы саветаў, аб павароце іх работы тварам да вытворчасьці, аб узьнікшай ролі саветаў у правядзеньні генэральнай лініі партыі, знайшлі вельмі слабае прапамленьне ў практычнай працы Гарадоцкага гарсавету.

У пачатку выбараў гарсавету адбыўся толькі адзін арганізацыйны пленум. Тры разы склікалі пленум па пытаньнях сяўбы, мабілізацыі сродкаў, ён ня зьбіраўся; да тых, хто не зьяўляўся на паседжаньні савету, ня прыняты ніякія меры.

Прэзыдыум увесь час працаваў бяз пляну. Толькі 7 красавіка быў складзен плян, які ня выконваецца.

Сэкцыі, праз якія павінна праводзіцца ўся масавая работа, не працуюць. Фінансавая, асьветная, зямельная і капэрацыйная яшчэ ні разу ня зьбіраліся.

Між тым камунальная гаспадарка не ўпарадкавана, жыльлёвыя пытаньні не ўрэгуляваны, водазабясьпечаньне дрэннае, прыгарадная гаспадарка, якой гарсавет павінен асабліва цікавіцца, знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы. Гарсавет не вядзе ніякай работы па калектывізацыі с.-г. у прыгарадным сельсавеце

Патрэбны рашучыя меры, каб ажывіць работу Гарадоцкага райсавету.

Ш.

Калі скончылася перавыбарчая кампанія...

(Завод „Камунар", Менск)

На машына-будаўнічым заводзе «КАМУНАР» ёсьць 9 членаў гарсавету. Перавыбарчая кампанія гарсавету на заводзе прайшла пры вялікім уздыме і энтузіязьме рабочых мас. У гарсавет паспаны лепшыя ўдарнікі—барацьбіты за пяцігодку.

Аднак, як толькі скончылася справаздачна-перавыбарчая кампанія, заводзкія арганізацыі спынілі работу. Ініцыятыва мас ня была падхоплена для арганізацыі сыстэматычнай цеснай сувязі паміж заводам і гарсаветам, для дапамогі апошняму ў рабоце.

ГАРСАВЕТ таксама нічога не зрабіў для сувязі з вытворчасьцю. ДА ГЭТАГА ЧАСУ НА ЗАВОДЗЕ ЯШЧЭ НЕ АРГАНІЗАВАНА ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА.

Бюро партыйнага калектыву ў свой час даручыла культпропу калектыву аформіць дэпутацкую групу, але культпроп пашоў у Чырвоную армію, не пасьпеўшы гэтага зрабіць, а бюро зусім забылася аб даручэньні. Заводзкі камітэт таксама ня цікавіцца гэтай справай.

Гарсавет да гэтага часу нават ня прыслаў палажэньня і інструкцый аб рабоце дэпутацкіх груп. Месяц назад гарсавет прыслаў свайго прадстаўніка на завод, але той нічога канкрэтнага не зрабіў і толькі даведаўся—ёсьць дэпутацкая група, ці не.

Трэба зараз-жа ліквідаваць гэты прарыў. «Камунар»—адзін з буйнейшых заводаў Менску—павінен мець працаздольную дэпутацкую групу, трымаць сыстэматычную сувязь з гарсаветам, дапамагаць яму ў перабудове сваёй работы.

М.

ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

(Завод Дрэваапрацоўшчык, Менск)

Ужо звыш месяца, як на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» існуе дэпутацкая група гарсавету. У групу ўвайшлі 32 чалавека з рабочага актыву заводу. Але група працуе слаба. Ніякага кіраўніцтва з боку партыйнага калектыву і заўкому няма. Вось прыклад работы групы.

Па пытаньні аб закрытым разьмеркавальніку група вынесла пастанову: **«перадаць пытаньне ў кваапэрацыйную сэкцыю гарсавету і прасіць аб рэарганізацыі разьмеркавальніка.»**

Як рэарганізаваць разьмеркавальнік у пастанове зусім не паказана, бо група не распрацоўвала гэтага пытаньня. Яна абмежавалася толькі фармальнай пастановай.

Такія-ж пастановы выносіліся і па іншых пытаньнях. Ці ёсьць якая-небудзь карысьць ад такой работы групы? Зразумела, не. Група павінна дэтальна распрацоўваць кожнае пытаньне і прадстаўляць яго на разгляд тэй ці іншай сэкцыі гарсавету ўжо падрыхтаваным.

Сувязі паміж гарсаветам і дэпутацкай групай заводу няма. Гарсавет амаль зусім ня кіруе работай групы.

Трэба ажывіць работу групы, выкарыстаць ініцыятыву рабочага актыву заводу, пераставіць дэпутацкую групу ў дзейнае зьвяно сувязі гарсавету з вытворчасьцю.

М. Сакалоўскі.

„Чакаем дапамогі гарсавету"

(Абутковая фабрыка, Менск)

На менскай абутковай фабрыцы ў красавіку па ініцыятыве партыйнай і прафэсыянальнай арганізацый арганізавана дэпутацкая група гарсавету. На чале групы стаіць стары рабочы — дэпутат гарсавету т. **Жыжэмскі.**

Гарсавет зусім ня кіруе работай групы. Нават палажэньне і інструкцыі аб дэпутацкіх групах не дасланы. У выніку група працуе невыстарчальна. Яна не арганізавала вакол сябе рабочага актыву. Працуюць толькі члены гарсавету (9 чал.).

Сакратар партыйнага калектыву па запытаньне — як працуе дэпутацкая група на фабрыцы — адказаў:

— Мы чакаем дапамогі з боку гарсавету, ня ведаем, як наладзіць работу дэпутацкай групы.

Гарсавет абавязан узмацніць сувязь з дэпутацкімі групамі, наладзіць жывое кіраўніцтва іх работай.

Хроніка

Адпускі навуковым работнікам

Наркамправы БССР вызначыў тэрміны карыстаньня водпускамі для работнікаў вышэйшых навучальных і навуковых устаноў.

Двухмесячным водпускам на працягу году карыстаюцца наступныя работнікі, якія вядуць пэдагагічную работу ў вышэйшых школах і работнікі навуковых устаноў: **прарэктары навучальных частак, дэканы, прафэсары, экадэмікі, дацэнты і асыстэнты.**

Кіраўнікі навукова-дасьледчай работы ў ВНУ і навуковых установах — **загадчыкі аддзелу, лябараторый і навукова-дасьледчых габінэтаў** — карыстаюцца 6-ці тыднёвым водпускам (36 рабочых дзён).

Усе іншыя навуковыя работнікі вышэйшых школ і навуковых устаноў чарговых і дадатковых водпусках.

Навукова-тэхнічныя работнікі і ўсе тэхнічныя работнікі ВНУ і навуковых устаноў карыстаюцца звычайным водпускам, у адпаведнасьці з правіламі аб чарговых і даведковых водпусках.

6 з паловай мільёнаў рублёў—на гідратэхнічныя работы ў БССР

Эканомсавет БССР зацьвердзіў плян работ па с.-г. гідратэхніцы ў БССР на 1931 год. На рэгуляваньне рэк БССР адпускаецца 1.054.000 руб., на правядзеньне магістральных каналаў—865.850 руб., інтэнсыўную ясушку ў калгасах—1.499.370 руб. і ў саўгасах—3.126.780 р.

У мэтах большай мэханізацыі гідратэхнічных работ, эканомсавет за прапанаваў Наркамзему дабіцца завозу ў бягучым годзе ня менш 6 экскаватараў, акрамя вызначаных раней 2 эскаватараў.

Паходная газэта на сплаве

Беларускі рабочком саюзу лесдрэўрабочых і рэдакцыя газэты **«Лесной рабочий»** арганізавалі паходную сплаўную газэту на баркасе. Газэта будзе выходзіць да канца сплаву на рэках БССР— **Сожы, Бярэзіне, Днепры, Дзьвіне** і інш.

Мэта газэты—барацьба за пасьпяховае выкананьне праграмы сплаву, за шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізоўваць масы на рашучае змаганьне з кулацкай агітацыяй сярод сплаўшчыкаў.

Партыйныя і грамадзкія арганізацыі сплаўных раёнаў павінна дапамагчы ў рабоце газэты.

Мастацкая выстаўка—перасоўка

Беларускі дзяржаўны музэй разам з арганізацыяй мастакоў БССР «РОМБ» арганізаваў мастацкую выстаўку-перасоўку для абслугоўваньня рабочых і працоўных са станам беларускага мастацтва, яго ўдзелам ў сацыялістычным будаўніцтве. Дагэтуль выстаўка працавала пры Доме Камасьветы. Зараз яна знаходзіцца ў Доме Працасьветы і значна папоўнена.

25 мая ў Гомелі адбудзецца 4 тыраж усесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму

Па-ударнаму правесьці дэкаду рэалізацыі лётарэйных білетаў

У студзені бягучага году пачалася рэалізацыя білетаў 5-й усесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму. У продаж было выдадзена 35 мільёнаў білетаў на суму 25 мільёнаў руб. Усе білеты разьбіваюцца на 10 разрадаў, прычым кожны разрад мае самастойны тыраж. Усяго ў 5-й лётарэі разыгрываюцца 340.872 выйгрышы на суму 4.010 тыс. р. Ужо адбыліся тры тыражы. ТЫРАЖ БІЛЕТАЎ 4-ГА РАЗРАДУ АДБУДЗЕЦЦА 25-ГА МАЯ Ў ГОМЕЛІ.

З якімі вынікамі прыходзіць беларуская арганізацыя Асоавіяхіму да тыражу?

Па БССР распаўсюджана 900 тыс. білетаў на суму 567.500 руб. На 10 мая лётарэйнаму камітэту ў Маскве пераведзена ад рэалізацыі білетаў 150,000 руб. Такім чынам, паступленьне грошай па рэалізацыі лётарэйных білетаў невыстарчальнае. Паасобныя раёны рэалізуюць білеты, але зусім не клапацяцца аб свае часовым пераводзе грошай.

БОРКАВІЦКАЯ, БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ, ГЛУСКАЯ, ГОРАЦКАЯ, ГАРАДОЦКАЯ, ЖУРАВІЦКАЯ, КОЙДАНАЎСКАЯ, КАПЫЛЬСКАЯ, КАМАРЫНСКАЯ, КРУГЛЯНСКАЯ, ЛЯДНЯНСКАЯ, ЛОЕЎСКАЯ, ЛЮБАНЬСКАЯ, ПАРЫЦКАЯ, ПРАПОЙСКАЯ, РАСОНСКАЯ, СМАЛЯВІЦКАЯ, СЬВІСЛАЦКАЯ, ХОЦІМСКАЯ, ЧЭРЫКАЎСКАЯ І ЦЕРАХАЎСКАЯ РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АСОВІЯХІМУ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ПЕРАВЯЛІ НІ АДНАГО РУБЛЯ АД РЭАЛІЗАЦЫІ ЛЁТАРЭЙНЫХ БІЛЕТАЎ і зусім не паведамляюць аб ходзе гэтай кампаніі. Гэтыя раённыя арганізацыі расьпісаліся ў сваёй бязьдзейнасьці, у недавацэнцы ўсесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму. Яны ня здолелі мабілізаваць актыўнасьці мас вакол задач узмацненьня абароны краіны.

Дзьве раённыя арганізацыі Асоавіяхіму паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. МСЬЦІСЛАЎСКАЯ арганізацыя атрымала ў канцы лютага 6.650 білетаў і праз два месяцы ўжо перавяла поўнасьцю ўсе грошы. АРШАНСКАЯ арганізацыя атрымала 20.000 білетаў і рэалізавала іх поўнасьцю датэрмінова. Арганізацыя разгарнула шырокае сацспаборніцтва паміж ячэйкамі па рэалізацыі білетаў і ўзяла таксама на буксір ПОЛАЦКУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ АСОАВІЯХІМУ, патрабаваўшы ад апошняй перадаць білетаў на 3.000 руб. для дадатковай рэалізацыі ў Воршы.

Гэтыя прыклады паказваюць, што тыя раённыя арганізацыі, якія надалі палітычнае значэньне кампаніі, дазгарнулі масавую работу, сацыялістычнае спаборніцтва паміж ячэйкамі, прыходзяць да тыражу 4-га разраду з перавыкананымі заданьнямі.

У сувязі з правядзеньнем 4-га тыражу лётарэі ў БССР, па ўсіх арганізацыях Асоавіяхіму з 20-га мая абвешчана ДЭКАДА РЭАЛІЗАЦЫІ БІЛЕТАЎ. Дэкада павінна быць праведзена па баявому. Тыраж лётарэі трэба скарыстаць для разгортваньня агітацыйна-масавай работы вакол узмацненьня матар'яльнай базы таварыства і папулярызацыі ідэй Асоавіяхіму — апоры мірнай працы і абароны краіны.

Н. ЧЭРВЕНЬСКІ.

За дзейсную рабселькораўскую заметку

Ударыць па магільшчыках самакрытыкі, па аматарах фармальных адпісак

Сіла пралетарскага друку — у цеснай сувязі яго з працоўнымі масамі, у тым, што мільённыя масы рабочых, калгасьнікаў і працоўнага сялянства, праз друк дапамагаюць партыі і савецкай ўладзе мабілізоўваць увагу грамадзкасьці на асноўных пытаньнях ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, рашуча змагацца з апартунізмам усіх масьцей, пашыраць лепшы вопыт барацьбы за сацыялізм, своечасова ліквідаваць прарывы і непаладкі.

У сьвятле вялізарных задач друку, асабліва важнае значэньне набывае **дзейнасьць рабселькораўскіх заметак.** Партыя аддае надавычай вялікую увагу пытаньням рэагаваньня на рабселькораўскія заметкі. Усялякае перэгаваньне на допісы, фармальна бюракратычныя адносіны да іх, марынаваньне заметак, па сутнасьці, зьяўляюцца заціскам самакрытыкі, за які трэба рашуча караць.

Якое становішча з рэагаваньнем на заметкі **рабселькораў газэты «Зьвязда»?** Мова лічбаў пацьвярджае вялікую дзейнасьць рабселькораўскіх заметак, надрукаваных у газэце. За 4 месяцы 1931 году па 500 рабселькораўскіх заметках сотні асоб прыцягнуты да адказнасьці судова-сьледчымі органамі і кантрольнымі камісіямі.

Мы маем вялікія дасягненьні рабселькораўскіх заметак у барацьбе за калектывізацыю, за правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, за кантрактацыю, за выкананьне прамфінпляну, у барацьбе з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнцамі да іх, з шавінізмамі розных колераў.

Вось прыклады дзейснасьці заметак: «Заметка «Што хачу то і раблю» пацьвердзілася. Меры да ачысткі насеньня прыняты. Старшыня калгасу «Ясная зорка» за безгаспадарчасьць зьнят з работы і адданы пад суд (Копыскі раён)».

«Заметка аб бязьдзейнасьці «Чарэйскага РВК абгаворана на прэзыдыуме РВК. За праявы правага апартунізму зьняты з работы старшыня РВК т. Анісаў».

«Па заметцы «Бягомльскі РКС сарваў ліквідацыю сахі ў калгасе», прыняты меры. З ліку занараджаных 300 плугоў адпраўлена 230; дадаткова па тэлеграфу занараджана з віцебскай базы 50 штук».

Там, дзе панує апартуністычная недаацэнка рабселькораўскага руху, дзе праводзіцца заціск самакрытыкі, дзе не разгорнута барацьба за поўнае выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, — там мы сустракаем фармальна бюракратычныя, напляваецельскія адносіны да рабселькораўскіх допісаў, там наглядаецца абураючае марынаваньне заметак.

На 30 проц. заметак не атрымана ніякіх адказаў.

Пастанова ЦКК КП(б)Б ад 11 сьнежня 1930 г., у якой дана выразная дырэктыва аб рэагаваньні, паказаны тэрміны адказаў, ігнаруецца ў радзе раёнаў. Адказы часта дасылаюцца праз 4-6 тыдняў. Ёсьць выпадкі згубы заметак.

Сьмілавіцкая РКК РСІ каля 2-х месяцаў пратрымала заметку «Патрэбна чыстка калгасу» і, нарэшце, прыслала наступны адказ: «Факты пацьвердзіліся, прыняты меры, але можна надрукаваць». Камэнтары да такога бюракратычнага адказу непатрэбны.

Селькор піша ў «Зьвязду» аб тым, што ў в. Радчанка няма калгасу, што да другой бальшавіцкай вясны не падрыхтаваліся, што пляны пасеўкампаніі да двара не даведзены, што справе калектывізацыі сельсавет не аддае патрэбнай увагі. Любаньскі РКС адказвае: «Заметка адпавядае сапраўднасьці; калгас «Асьвета» мае прыліў у 52 гаспадаркі». Гэта фармальная адпіска, гэта сапраўдны зьдзек з рабселькораўскай заметкі. Інакш такі адказ назваць нельга.

Вельмі часта сустракаюцца і такія адказы: «Меры прыняты, ставім пытаньне, пытаньне будзе разгледжана». Гэтыя адказы сьведчаць аб тым, што іх пісалі апартуністы - бюракраты, якім не па нутры бальшавіцкія тэмпы, якія іх пісалі апартуністы - бюракраты, якім і імкнуцца толькі «адпісацца».

У месячнік друку трэба з усёй пострасьцю паставіць пытаньне аб своячасовым і дакладным рэагаваньні на рабселькораўскія заметкі. Ні адзін допіс не павінен застацца без адказу.

Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці ўсіх тых, хто марыць рабселькораўскія заметкі, хто трымае іх над спудам, затрымліваючы гэтым разгортваньне творчай ініцыятывы працоўных мас, ставячы палку ў калёсы барацьбы мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага наступленьня.

Новікаў.

Паведамленьні:

— 25 мая, у 12 гадз. адбудзецца пасяджэньне мэтадычнай камісіі Культпропу ЦК КП(б)Б, разам з францыяй праўленьня т-ва гісторыкаў-марксыстаў. Павінны зьявіцца т. т. **Клімковіч, Ошараў, Лур'е, Левін, Поташ, Модэль, Гімельфарб, Улазаў, Сэрбэнта, Югаў, Шчарбакоў, Зюзькоў, Віткоўскі, Рудзіцкі, Стальны, Кічэк.**

— Сёньня, 24 мая, у 20 гадзін, у 302 аўд. гал. корп. адбудзецца вытворчая нарада факультэту савбуду і права па пытаньні мэтадаў выкладаньня і ўліку. Пажадана прысутнасьць студэнтаў, прысутнасьць навуковых работнікаў абавязкова.

— Сёньня, 24 мая, у 13 гадз. інстытут асьпірантуры склікае агульную нараду ўсіх асьпірантаў клініцыстаў разам з кіраўнікамі клінік па пытаньні падрыхтоўкі. Яўка абавязкова.

— **Парттройкай Мен. гарКК КП(б)Б** выклікаюцца на 25 мая г. г., у 6 гадз. веч. (Энгельса, 28) наступныя т. т.: Аляксееў І. М. (МЦРК), Зільбэрт (зав. «Камунар»), Мазо (яч. СНК), Грапчэнкаў С. І. (узвод аховы МББ ч.), Зялёнка С. Я. (саюз Нархарч.), Казлоў (ВЭА), Гурэцкі (ЦП працмат.), Малашка З. К. (Новадворск. яч.), Малашонак, Лепяшынскі (курсы горн. тэхнікаў), Сазонаў (зав. «ДА»), Гінзбург (Мэталяўстановы), Рудзінскі (каўбасн. ф-ка), Чарлёнак А. К. (НКЮ), Розэнблюм, Чыж, Верхалеўскі (курсы чырв. дырэкт.), Варламаў А. Т., Конанаў П. Б. (Астр.-Гарада. р-н), Батура (Папярнянскі с/с.), Гуткін І. М., Мікуліч А. В., Трыбуц М. К., Одэр В. Л., Александровіч Я. С., Зэльдовіч С. Л., Гельмановіч, Ледзян—для ўдзелу ў разглядзе іх справу. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце. Яўка ўсіх памянёных т. т. абавязкова.

— **Мен. гарКК КП(б)Б і РСІ** паведамляе, што на 26 мая, у 7 гадз. веч. склікаецца нарада па-заштатных інспэктароў КК-РСІ. Яўка ўсіх т. т. абавязкова.

— **Валканоўскага Уладыслава Сьцяпанавіча,** раней працаваўшага ў камітэце па стандартызацыі, просяць зайсьці ў ЦКК-РСІ (Савецкая, 55, пакой № 15) да т. Чарнага. Асоб, якія ведаюць месца прабываньня Валканоўскага, просьба паведаміць ЦКК НК-РСІ.

— 24 мая ў 7 гадз. вечара ў габінэце рэдактара газэты «Зьвязда» адбудзецца нарада па арганізацыі асьвятленьня пытаньняў літаратуры ў «Зьвязьдзе».

На нараду запрашаюцца т. т. **Рычноў, Галавач, Лыньноў, Сяньневіч, Лімэноўскі, Чарот, Александровіч, Бранштэйн, Бэндэз, Гальперына, Аляхновіч, Кучар, Мурашка, Некрашэвіч, Салагуб.**

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Камс. б. Кунько А. З. 172 * Проп. 20 Уласава І. П., 173 * Камс. б. 77473 Кіпрыянца М. Я., 174 * Кн. мэдагл. Грыба Е. Ф., 175 * Курс. пасьв. Шульмана А. Ш., 176 * Каап. кн. Ананько В. Я., 177 * Вайск. б. Скарупцкага Б. Я., 178 * Чл. б. с. СГЛР 42127 Таўкача К. Т., 179 * П/б. Жук А. Я., 180 * Дав. аб інв. Папрукайла А. С., 181 * Чл. б. с. СГЛР Бельямінава М. Я., 182 * Вайск. б. Малашэвіча М. Ф., 183 * Вайск. б. Жыгалка А. П., 184 * Каап. кн. Ермаловіча К. А., 185 * Каап. кн. Кіселя І., 186 * Чл. б. с. СГЛР 103106, карс. б. ЦПІ Плашчынскага М. Г., 187-188 * Вайск. б. Кунцэвіча М. О., 189 * Чырвонаарм. кн. Шпакоўскага Я., 190 * Дапрыз. кн. Бугла Л., 191 * Кон. карт., мэтр. вып. Малашка А., 192-193 * Вайск. б. Марголіна Н.—Л. Р., 194 * Пуцёўка біржы працы Тамашэўскай Л. Д., 195 * Вайск. б. Баранова С. П., 196 * Канд. к. 38248 Астапковіча М. К., 197 * Вайск. б. Шэгмантовіча Т. В., 198 * Мэтр. вып. Масягеровіча А. І., 200 * Вайск. б. Яраш эвіч К. А., 201 * Чл. б. РЗЛ 22176 Маазура А. С., 201 * Мэтр. вып. Перафідовіча В. В., 203 * П/б. 0818575, чл. б. с. РЗЛ Цішчанкі А. В., 204-205 * Лек. кн. Гацкевіч Ю. П., 206 * Чл. б. с. друк. Туронача І. Р., 208 * Рэгістр. карт. 8004 Махга М. Р., 209 * Мэтр. вып. Пашкевіча Р. Г., 210 * Мэтр. вып. Калюцкай В. Ф., 211 * Мэтр. вып. Курціка М., 212 * П/б 1308704, дав. на Круп. спаж. т-ва Гурэвіч І. Я., 213-214 * Пасьв. 393 на атр. дап. Крыгель Н., 215 * Бюл. Крукі Б. А., 216 * Вайск. б., дав. аб сац. стан. Лабанка К. П., 218-219 * Вайск. б. Кавіцкага А. С., 220 * Чл. б. с. працаспа Ліпніцкай Э. П., 221 * Чл. б. с. буд. Марынчыка В. Л., 222 * Пасьв. ас. Цукермана Н. Е., 223 * Пасьв. ас. Шліонскай Д. Х., 224 * Мэтр. вып. Жыгулеўскага А. Я., 225 * Мэтр. вып. Наркевіч М. Я. 226 * Чл. б. с. харч. Лейбава В. Л., 23[illegible] * Чл. б. 459 с. камун. Ярча Г. М., 22[illegible] * Кон. карт. Вінецкага Ш. В., 22[illegible] * Дав. аб сац. стан. Лось Т. Т., 23[illegible] * Вайск. б. Місько С., 231 * Кніт Леопрамгасу Місько С., 232 * Вайск. б., чл. б. с. СГС, студ. пасьв. Нэйгаўзена Н. С. 233-235 * Вайск б. Згвалт Я. Р., 23[illegible] * Чл. б. с. нархарч Цірыбель - Машчынскай Е. А., 238.

„Чырв. Зорка" Пач. 7;8-45;10-30 — З 20 мая новы цікавы фільм УСЁ СПАКОЙНА... Драма ў 7 частках

„Культура" Пач. 1 с. у 7 гадз. — 2 фільмы ў адзін сэанс 2 1) Чырвонцы ў 5 частках 2) Сімба ў 5 частках

Інтэрнацыянал